WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 ЛЮТАГА 2012 г.
СУБОТА
№ 28
(27143)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«У БЕЛАРУСКІМ ПАРЛАМЕНЦЕ НОВАГА СКЛІКАННЯ ПАВІННА БЫЦЬ ЗАХАВАНА ПЕРАЕМНАСЦЬ»

У беларускім парламенце новага склікання павінна быць захавана пераемнасць. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў учора на сустрэчы са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам Андрэйчанкам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, у Беларусі склалася практыка, калі ў новы склад парламента выбіраюцца 20-25 працэнтаў дэпутатаў папярэдняга склікання. «Нам трэба мець у новым парламенце прыкладна чвэрць дэпутатаў старога, каб захаваць пераемнасць. Але гэта сапраўды павінны быць дэпутаты дасведчаныя ў сваёй рабоце з насельніцтвам, у выбарчых акругах. Людзі ж да іх больш прыдзірліва будуць ставіцца. Таму пераемнасць — гэта вельмі важнае пытанне».

«Па-другое, як бы мы тут не дэмакратызаваліся, як бы мы ні заяўлялі аб тым, што мы далёка стаім ад гэтага працэсу выбараў, я лічу, вам асабіста як старшыні давядзецца ўсё ж такі прымаць удзел у арганізацыі гэтай кампаніі. Можа, нават Савету Палаты прадстаўнікоў вызначыць мерапрыемствы ў дапамогу Цэнтральнай выбарчай камісіі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Усё ж такі дэпутаты — гэта прадстаўнікі нашых выбаршчыкаў, і наўрад ці хто-небудзь прэтэнзіі прад'явіць, калі яны дапамогуць па-чалавечы, дэмакратычна арганізаваць працэс выбараў. Таму тут таксама трэба вызначыцца».

«І, па-трэцяе, калі завяршаецца работа цяперашняга парламента, трэба разам з урадам, перш за ўсё старшыням камісій, савету, вам вызначыць тыя першачарговыя пытанні, якія неабходна вырашыць, каб прыгожа і дастойна завяршыць цяперашняе склікание. Гэта таксама вельмі важна. І шэраг іншых пытанняў, якія могуць паўстаць перад парламентам у гэтыя апошнія месяцы работы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама рэкамендаваў дэпутатам, каб яны актыўна папрацавалі з насельніцтвам. «У нас пайшло сур'ёзнае паляпшэнне сітуацыі ў краіне з пункту гледжання эканомікі. Але, як і любы выхад са складанай сітуацыі, гэта адбываецца нераўнамерна. Дзесьці, як я гаварыў учора на нарадзе, выйшлі на заработную плату і ў $800-900, а дзесьці яшчэ і да $200 не дацягваюць. Нам праз год-паўтара трэба аднавіць дакрызісны ўзровень даходаў насельніцтва, можа крыху і перасягнуць яго, каб людзі разумелі, што мы не проста размовамі займаліся ў свой час. Паабяцалі — трэба зрабіць. У гэтым плане хацелася б, каб дэпутаты актывізаваліся, — сказаў Прэзідэнт. — Гэта значыць, трэба людзей падрыхтаваць да парламенцкіх выбараў, і, лічу, дэпутаты, кожны ў сваёй акрузе, павінны гэтым заняцца».

«Трэба з адміністрацыяй, урадам прапрацаваць злабадзённыя актуальныя пытанні, з якімі дэпутаты пойдуць да людзей, каб яны пункт гледжання Прэзідэнта змаглі данесці, пагаварыць з людзьмі. Мы павінны атрымаць зваротную сувязь па комплексе пытанняў, якія мы вырашым і павінны вырашаць напярэдадні парламенцкіх выбараў. Як ні круці, гэта экзамен для ўлады. Трэба загадзя вырашыць гэтыя пытанні, каб нас народ менш папракаў потым на парламенцкіх выбарах і каб потым нашы «свядомыя» з «пятай калоны» ўнутры і асабліва на Захадзе не выказвалі нам прэтэнзіі па складзе будучага парламента», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

«Я ўпэўнены, што парламент будзе выключна ад народа. Туды балбатуны не трапяць, а прыйдуць людзі, якія гатовы вырашаць пэўныя пытанні. Вам з дэпутатамі трэба вылучыць гэтыя пытанні. Няхай іх будзе 50, 70, сотня, але гэта будзе для нас праграма работы да парламенцкіх выбараў. А нейкія пытанні застануцца на потым», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Уладзімір Андрэйчанка расказаў, што дэпутаты ў сваёй рабоце асноўную ўвагу ўдзяляюць пытанням якасці і тэрмінам падрыхтоўкі законапраектаў. За час работы папярэдняй, дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання прынята больш за сто законапраектаў. Паспяхова вялася работа беларускіх парламентарыяў і на міжнароднай арэне. Так, у верасні мінулага года парламент Беларусі атрымаў статус наглядальніка ў Міжпарламенцкай асамблеі АСЕАН, прадоўжыліся плённыя кантакты з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Таксама ў Беларусі праведзена пасяджэнне Савета Парламенцкай асамблеі АДКБ.

Дэпутаты актыўна працавалі ў сваіх выбарчых акругах, вялі прыём грамадзян, разглядалі іх звароты.

Напружаная работа чакаецца на чарговай, дзясятай, сесіі, якая пачне работу 2 красавіка. На сёння ў камісіях Палаты прадстаўнікоў на разглядзе знаходзіцца больш за 50 законапраектаў, у тым ліку новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса, шэраг законапраектаў эканамічнага характару. Што датычыцца міжнароднай дзейнасці, то ў парламенце вядзецца работа над тым, каб у 2012 годзе атрымаць статус наглядальніка ў Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора.

Прэзідэнт звярнуў увагу на неабходнасць больш эфектыўна праводзіць маніторынг прымаемых законапраектаў, часцей сустракацца з выбаршчыкамі, працоўнымі калектывамі. Да распрацоўкі законапраектаў варта больш актыўна прыцягваць вучоных, прадпрымальніцкія структуры, спецыялістаў і кіраўнікоў адпаведнага профілю.

У ходзе сустрэчы сур'ёзная ўвага была ўдзелена пытанню гарманізацыі нацыянальнага заканадаўства з дагаворна-прававой базай Адзінай эканамічнай прасторы. Прэзідэнт таксама адзначыў, што замежныя камандзіроўкі парламенцкіх дэлегацый павінны праходзіць больш плённа, каб у іх ходзе разглядаліся не толькі пытанні парламенцкай, але і знешнегандлёвай дзейнасці, узніманліся тэмы развіцця культурных сувязяў, супрацоўніцтва ў галіне аховы здароўя, адукацыі, спорту і турызму.

КАДРАВЫЯ РАШЭННІ

Аляксандр Лукашэнка, кіруючыся пунктам 11 артыкула 84 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, вызваліў Ганну Сакалоўскую ад пасады суддзі Вярхоўнага суда ў сувязі з назначэннем на іншую пасаду з далейшым інфармаваннем аб яе вызваленні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Адпаведны ўказ Прэзідэнт падпісаў 9 лютага.

БЕЛТА.

Другі сакратар пасольства Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Рэспубліцы Беларусь Марыя Алена РОХАС і дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман МАТУЛЬСКІ.

ЛІТАРАТУРНЫ ПАДАРУНАК

Госці з Венесуэлы ў захапленні ад Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і параўноўваюць яе з «Вавілонскай бібліятэкай» Борхеса

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Старшыня Цэнтра лацінаамерыканскіх даследаванняў імя Рамула Гальегаса Раберта Эрнандэс МАНТОЯ і Ганаровы старшыня ГА «Міжнародная асацыяцыя беларусістаў» Адам МАЛЬДЗІС.

ДЭЛЕГАЦЫЯ з Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла, у складзе якой лацінаамерыканскі пісьменнік Луіс Брыта Гарсія, наведала ўчора Нацыянальную бібліятэку Беларусі (НББ). Нагодай стала перадача ў дар шэрагу навуковых і навукова-папулярных выданняў.

Агулам Нацыянальная бібліятэка атрымала больш за сотню кніг. Перададзеныя ў дар выданні — вынік працы выдавецтваў Міністэрства культуры Венесуэлы, выданні пад грыфам Міністэрства адукацыі, а таксама Народнага банка Венесуэлы. Асобна вылучаны кнігі Венесуэльскага Інстытута навуковых даследаванняў — дапаможнікі па фізіцы, хіміі і матэматыцы.

Перадача кніг у нацыянальныя бібліятэкі замежных краін, паводле слоў **другога сакратара пасольства Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Рэспубліцы Беларусь Марыі Алены РОХАС,** практыкуюцца даволі часта. Як прызнаецца дыпламат, у асноўным гэта тыя краіны, у якіх працуюць консульствы Венесуэлы.

Адна з галоўных кніг, перададзеных у дар НББ, — фотаальбом «Венесуэла. Зачараванне поўдня». Выданне распавядае пра паўднёвую частку Венесуэлы, дзе размешчана самае старажытнае на Зямлі пласкагор'е па геакліматычнай зоне. Фотаальбом, перакладзены на рускую мову, заняў адметнае месца і на кніжнай выстаўцы-кірмашы.

— Нашы беларуска-венесуэльскія адносіны пачалі наладжвацца нават раней, чым у нас з'явілася пасольства гэтай краіны, — зазначыў **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман МАТУЛЬСКІ**. — Яны заўсёды праходзілі ў вельмі цёплай і сяброўскай атмасферы, таму сённяшняя падзея — чарговае пацвярджэнне прыязных адносін паміж абодвума бакамі.

Як распавёў **лацінаамерыканскі пісьменнік Луіс Брыта ГАРСІЯ**, у Венесуэле да нядаўняга часу ў некаторых раёнах сярод насельніцтва яшчэ сустракалася непісьменнасць.

— Аднак за апошнія гады мы зрабілі шмат для таго, каб перамагчы гэты хіб. У прыватнасці, сёння мільёны людзей у Венесуэле атрымліваюць кнігі бясплатна. Карысць кніга прыносіць толькі тады, калі яна даступна як мага большай колькасці людзей.

— Большасць кніг у Венесуэле — сапраўды бясплатныя, — дадае старшыня Цэнтра лацінаамерыканскіх даследаванняў імя Рамула Гальегаса Раберта Эрнандэс Мантоя. — У нас вы не знойдзеце кнігі, кошт якой перавышае адзін еўра. Большасць часопісаў у краіне таксама распаўсюджваюцца як бясплатныя ўкладкі ў газеты. Нядаўна ў навучальных мэтах дзецям і моладзі мы раздалі бясплатна 900 тысяч ноўтбукаў.

Ілья ЛАПАТО.

КРАІНЕ ПАТРЭБНЫ НЕ ТОЛЬКІ СПЕЦЫЯЛІСТЫ, АЛЕ І АСОБЫ

Браць на сябе адказнасць за людзей, якімі давядзецца кіраваць. Не толькі самому рухацца па службовай лесвіцы, але і падначаленым даць магчымасць раскрыцца. Менавіта гэтаму вучыліся ўдзельнікі адукацыйнага форуму для перспектыўнага кадравага рэзерву, які прайшоў у Мазырскім раёне. Ну а самае галоўнае — сучасны кіраўнік павінен быць патрыётам сваёй краіны. Такую думку выказаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр РАДЗЬКОЎ, які прыняў удзел у форуме. Ён адзначыў, што створаная ў краіне сістэма падрыхтоўкі кадраў накіравана на тое, каб таленавітая моладзь знаходзілася ў авангардзе.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ уручыў членскія білеты грамадскага аб'яднання «Белая Русь».

— Трэба, каб чалавеку было ўтульна на сваім працоўным месцы, у грамадстве, у дзяржаве. Сёння сярод рэзерву кадраў — інжынеры, вучоныя, настаўнікі. Наша задача — падрыхтаваць іх не столькі тэарэтычна, колькі практычна, каб яны навучыліся кіраваць у сённяшніх умовах. Многім пакуль што не хапае сучасных псіхалагічных ведаў, ведання замежных моў, практычных навыкаў, каб адчуваць перспектывы развіцця краіны ў цэлым. Задач шмат, і мы імкнёмся, каб кадравы рэзерв меў магчымасць сябе рэалізаваць.

Самае галоўнае, адзначыў Аляксандр Радзькоў, у сапраўднага кіраўніка павінен быць стрыжань, а таксама разуменне, што тут — яго зямля, яго радзіма. Развіццё лідарскіх якасцяў, кіраўнічых здольнасцяў, пашырэнне далягляду, умацаванне грамадзянскай пазіцыі — такія задачы былі пастаўлены перад будучымі кіраўнікамі, уключанымі ў перспектыўны кадравы рэзерв Гомельскага аблвыканкама. Выкладчыкі Акадэміі кіравання правялі трэнінгі па прафесійна-асобасным росце і плянаванні кар'еры, пазнаёмілі з новымі тэхналогіямі ў працы з перспектыўнай моладдзю. Акрамя таго, паміж Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і Гомельскім аблвыканкамам было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве. Аналагічныя пагадненні трохі раней былі падпісаны з кіраўніцтвам Брэсцкай і Мінскай абласцей, расказаў рэктар Акадэміі кіравання Анатоль Маразевіч:

— Гэта пагадненне арыентавана на сістэмную падрыхтоўку перспектыўнага кадравага рэзерву. Мы ажыццяўляем метадычную, метадалагічную падтрымку тых вучэбных устаноў, якія рыхтуюць і перападрыхтоўваюць кадры ў нашай краіне. Цяпер стане магчымым атрымліваць веды і з дапамогай інтэрактыўных тэхналогій.

Падчас правядзення адукацыйнага форуму ўвесь калектыў настаўнікаў Рудненскай сярэдняй школы, якую наведалі ўдзельнікі адукацыйнага форуму, быў урачыста прыняты ў шэрагі грамадскай арганізацыі «Белая Русь». Пасведчанні ім уручыў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў, які з'яўляецца старшынёй гэтага грамадскага аб'яднання.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Фінансавы тыдзень

ДОЛАР ПАЧАЎ ЗНОЎ ТАННЕЦЬ

Грэцыі ставяць новыя ўмовы, еўра сталі больш давяраць, у Беларусі зніжаецца стаўка рэфінансавання — вось асноўныя фінансавыя навіны тыдня.

Раніцай умовы — увечары грошы

Еўрапейскія міністры фінансаў учора адклалі падпісанне дакумента аб прадастаўленні Грэцыі фінансавай дапамогі, паведамляе Financial Times. Спачатку Афінам трэба выканаць тры ўмовы: па-першае, грэчаскі парламент на пасяджэнні 12 лютага павінен пацвердзіць план дзеянняў, які быў раней узгоднены з еўразонай; па-другое, неабходна вельмі хуценька вызначыць структуру скарачэння выдаткаў на 325 мільёнаў еўра; па-трэцяе, ад лідараў палітычных партый патрабуюць сур'ёзных палітычных гарантый выканання захадаў. Днём раней стала вядома, што партыі ў Грэцыі дамовіліся аб жорсткай эканоміі, якой чакаюць у Еўрацэнтрабанку. Аднак прафсаюзы арганізавалі сур'ёзную забастоўку супраць тых самых захадаў жорсткай эканоміі. Цягнуцца яна будзе да суботняга вечара. Зараз на радзіме дэмакратыі паралізавана работа дзяржаўных устаноў, школ, шпіталяў і гэтак далей, амаль не ходзіць грамадскі транспарт. У Грэцыі колькасць беспрацоўных перавысіла 1 мільён чалавек (гэта 20,9% эканамічна актыўнага насельніцтва), а прадугледжваюцца яшчэ звальненні супрацоўнікаў дзяржсектара і скарачэнне заробкаў ды пенсій. Людзі плануюць пратэставаць і ў нядзелю, калі парламент павінен будзе прыняць рашэнне. Ці паўплывае на палітыкаў незадаволенасць людзей, невядома, але без прыняцця вышэйазначаных умоў Грэцыя ў канцы сакавіка не зможа пагасіць свае даўгі.

Верагоднасць атрымання Грэцыяй дапамогі нязначна аднавіла давер да еўра на міжнародных таргах. Але ж праблемы еўразоны ўсё роўна яшчэ не вырашаны. Нават у Англіі канстатавалі ўступленне ў фазу рэцэсіі — урад думае, як прастымуляваць эканоміку.

Захоўвайце грошы ў... банках пад вялікія працэнты

Долар пачаў таннець. Прычым не толькі ў Беларусі. Акрамя таго, што гэта адбылося адносна еўра, у Расіі таксама на гэтым тыдні назіралася падзенне долара ніжэй за 30 рублёў. Калі ў суседкі гэта абумоўлена высокімі цэнамі на нафту і цікавасцю інвестараў да расійскага фінансавага рынку, то ў нас, хутчэй за ўсё, значным павелічэннем даверу да беларускага рубля ў выглядзе росту дэпазітаў у нацыянальнай валюце. Людзі спяшаюцца атрымаць вялікія працэнты, каб не пацярпець ад інфляцыі, якая сёлета, верагодна, будзе значна меншай за дэпазітныя стаўкі. Але стаўка рэфінансавання ўжо пачынае сваё зніжэнне (з 15 лютага — да 43% гадавых). Адпаведна будуць падаць і стаўкі па ўкладах, што можа выклікаць «уцёкі» ўкладчыкаў. Таму невядома, наколькі доўга прывабнасць нацыянальнай валюты будзе працягвацца. Усё будзе залежаць ад дзеянняў урада і Нацыянальнага банка.

А пакуль мы маем патаннелы за тыдзень на 100 рублёў долар (мінус 1,2%) за 8330, на 30 рублёў еўра (мінус 0,3%) за 11040 і расійскі рубель, які застаўся на тым жа ўзроўні.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

БЕЛАРУС БЕЗ ПРАЦЫ НЕ МОЖА

Такія вынікі паказала апытанне каля пяці тысяч работнікаў розных сфераў дзейнасці і ўзроўню занятай пасады, якое правёў інтэрнэт-сайт RABOTA.TUT.BY.

76% беларускіх работнікаў хочуць працаваць нават пасля выхаду на пенсію. Як сказала дырэктар сайта Святлана Шапарава, «вынікі паказваюць, што беларусы гатовыя працаваць максімальна доўга, толькі б дазваляла здароўе». 23% апытаных могуць жыць на працэнт ад укладу ў банку ці зберажэнні, а хтосьці (8%) — за кошт сродкаў родзічаў ці спонсара. Дарэчы, цікавы факт: з тых, хто гатовы працаваць да пенсіі і пасля, трэць хоча жыць дзе-небудзь за горадам, трэць збіраецца атрымліваць прыбытак ад свайго бізнэсу, яшчэ адна трэць хоча ўдзельнічаць у біржавых таргах. А калі б у рэспандэнтаў з'явілася буйная сума грошай, якая магла б ім забяспечыць бязбеднае існаванне да канца жыцця, то 68% усё роўна працягвалі б працаваць.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НОВАЙ КУПЮРЫ ПАКУЛЬ ЯШЧЭ НЯМА

Пастанова Нацыянальнага банка №31 ад 31 студзеня 2012 года «Аб выпуску ў абарачэнне банкноты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь узору 2000 года наміналам 200000 рублёў» была размешчана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Гэтая інфармацыя стала прычынай з'яўлення чутак у інтэрнэце, быццам новыя 200-тысячныя купюры, якіх чакаюць яшчэ з лістапада мінулага года, ужо надрукаваныя і павінны паступіць у абарачэнне.

Аднак гэта не зусім так. Карэспандэнт «Звязды» звярнуўся па ўдакладненне ва ўпраўленне інфармацыі Нацбанка. Там растлумачылі, што яшчэ ўсё дапрацоўваецца, і новай банкноты ніхто пакуль не бачыў. Прадстаўнік Нацбанка падкрэсліў, што ўвод новай купюры ў абарачэнне будзе абавязкова ўрачыстым і пра яго будуць ведаць усе. Чакаецца, што адбудзецца гэта ў сярэдзіне сакавіка.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

НЕЗВЫЧАЙНАЯ ШЧОДРАСЦЬ

Невядомы брастаўчанін ахвяраваў на будаўніцтва храма кілаграмовы злітак золата.

А можа, гэты чалавек і не брастаўчанін. Проста адной з марозных раніц ён падышоў да скрынкі з ахвяраваннямі, што ў краме на ўскрайку абласнога цэнтра, і апусціў туды... залаты злітак. Гэтую краму доўга называлі «На балоце» за тое, што побач была пустка, якая нагадвала балоцістую мясцовасць. Потым фірма «Прадтавары» назву замацавала афіцыйна, і з'явілася адпаведная шыльда. Як і ў многіх гандлёвых пунктах, там устаноўлена скрынка для ахвяраванняў. Менавіта ў гэтай краме ідзе збор на будаўніцтва Спаса-Хрыста-Раджэственскага храма, які ўзводзіцца ў новым мікрараёне «Вулька». Апошнім часам будоўля была спынена з-за недахопу сродкаў...

Кавалак золата між дробных купюр заўважыў ахоўнік гандлёвага прадпрыемства. Ён і паведаміў пра гэта адміністрацыі. У прысутнасці рэвізійнай камісіі прыхода, які арганізаваў збор, скрынку адкрылі і ахвяраванне перадалі настаяцелю праваслаўнага прыхода. Назаўтра злітак быў прададзены Нацбанку, а грошы пералічаны на рахунак храма. Як паведаміў журналістам настаяцель храма Яўген Ліхота, цяпер з'явілася магчымасць пагасіць доўг будаўнікам і працягнуць работы па ўзвядзенні храма. А за невядомага чалавека, які падарыў на богаўгодную справу амаль 55 тысяч долараў у эквіваленце, будуць маліцца прыхаджане.

Яна СВЕТАВА.

У ЦЯГНІКУ «ЗГУБІЛАСЯ» 180 ТЫСЯЧ «ЗЯЛЁНЫХ»!

Прэс-служба ўкраінскай мытні расказала пра неверагодную знаходку: у цягніку Кіеў — Мінск супрацоўнікі Чарнігаўскай мытні і пагранічнікі Чарнігаўскага пагранічнага атрада знайшлі... 180 тысяч долараў.

Адшукаць уладальніка значнай сумы грошай пакуль не атрымалася. Сама ж валюта была прыхавана ў нерабочым тамбуры аднаго з вагонаў: у аддзяленні для смецця каля ўваходу ў прыбіральню былі знойдзены тры кардонныя каробкі, якія былі абматаныя клейкай стужкай. Іх змесціва ўяўлялі сабой 18 пачкаў па 10 тысяч долараў кожная. Праваахоўнікі склалі пратакол агляду месца здарэння і канфіскавалі грошы. Па факце незвычайнай знаходкі праводзіцца праверка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества	Лот № 1 — А/м МАЗ 5516А-5380, 2008 г.в., гос. номер АВ 0592-2, стоимостью 160 531 991 рубль.
Собственник (владелец) имущества	ОАО «АТП № 10»
Местонахождение (адрес) имущества	г.п. Россоны, ул. Машерова, 59
Место (адрес), дата и время проведения торгов	г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 318 14.03.2012 в 11.00
Справочная информация об организаторе торгов	Хозяйственный суд Витебской области: 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 318, http://vitebsk.court.by/ тел.факс. (80212) 49 13 45, (8 029) 366 40 15 судебный исполнитель Бураков Игорь Вячеславович, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович тел. (80212) 49 13 40 (8044) 746 73 00
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670 не позднее 17 часов 13.03.2012. Минимальная величина первого шага — 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ОБЪЯВЛЕНИЕ о повторных торгах

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-16865, наименование – здание пункта приема стеклотары, общей площадью 49,4 кв.м, фундамент – бетонный, стены – кирпичные, перекрытия – железобетонные, кровля – совмещенная рулонная, имеется электричество – 18 606 720 рублей.
Собственник (владелец) имущества	ЧСУП «ДиСаВаСтрой» (Орша, ул. Мира, 16-41, УНП 390430217).
Местонахождение (адрес) имущества	Витебская область, г. Орша, ул. Пустельникова, здание пункта приема стеклотары.
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Хозяйственный суд Витебской области г. Витебск, ул. «Правды», 32 29 февраля 2012 года в 11.00.
Справочная информация	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 324 http:// vitebsk.court.by Судебный исполнитель Халков Дмитрий Вячеславович, тел./факс. (80212) 49 13 42, (8 029) 150 24 10. Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40.
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.02.2012 г. (для б/н разлікаў)

▲1 долар ЗША	8 330,00	1 чэшская крона	439,28
▲1 еўра	11 040,00	1 польскі злоты	2 626,10
1 латвійскі лат	15 810,95	▲1 расійскі рубель	279,00
1 літоўскі літ	3 200,09	1 украінская грыўня	1 037,49

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	29,8923
10 UAH	37,2360
10000 BYR	36,1892
EUR	39,6282

Агенства Уладзіміра Грыцкова

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАПАТРАБАВАЎ НАВЕСЦІ ПАРАДАК У СФЕРЫ ПАЛЯВАННЯ І ПАЛЯЎНІЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Такую задачу ён паставіў 10 лютага, прымаючы з дакладам старшыню рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» (РДГА «БТПР») Юрыя Шумскага і першага намесніка старшыні Мікалая Бамбізу, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«Мы з вамі некалькі месяцаў таму дагаварваліся аб тым, што вы ўнесяце сваё прынцыповае меркаванне аб далейшым функцыянаванні Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Звязана гэта перш за ўсё з тымі недахопамі, якія выявіліся, іх мы бачылі ў ходзе работы гэтай арганізацыі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Недахопаў, я лічу, шмат, і вы іх убачылі яшчэ больш выразна, чым іншыя. Я чакаў вашых прапаноў у гэтым плане».

Прэзідэнт падкрэсліў, што гэта арганізацыя павінна адыгрываць у краіне больш важкую ролю, чым да гэтага часу.

«Па-першае, паляванне і рыбалка — гэта неад'емная частка турызму. Калі турыст сюды прыязджае — гэта не толькі адпачынак. Напэўна, больш як палавіна з іх хочуць папаляваць, выехаць на рыбалку і г.д. Таму гэта эканамічны складальнік. І ў сувязі з гэтым мы не можам дапусціць таго, што рабілася ў гэтай арганізацыі. Мы не можам здабытак нашай дзяржавы, нашага народа разбазарваць, больш таго — па-бандыцку да яго ставіцца. А яшчэ горш, калі гэта сфера крыміналізуецца, і там адбываюцца нядобрыя працэсы. Вы павінны былі іх таксама заўважыць, вывучаючы сітуацыю ў арганізацыі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. У сувязі з гэтым ён нагадаў, што перад новым старшынёй была пастаўлена задача разабрацца з кадравымі пытаннямі, вызначыць тых, з кім трэба будзе працаваць у далейшым.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў павінна заняць больш значную ролю ў гэтай сферы, паколькі ў яго сканцэнтраваны асноўныя паляўнічыя ўгоддзі краіны (60 %).

«Я ад вас перш за ўсё павінен атрымліваць інфармацыю аб праблемах у гэтай галіне, аб тым, у якім напрамку яна павінна развівацца, якая сітуацыя там складваецца. Таму на вас будзе большая адказнасць, чым раней, і я больш уважліва буду працаваць з вамі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама лічыць неабходным, каб БТПР больш цесна ўзаемадзейнічала з Дзяржаўнай інспекцыяй аховы жывёльнага і раслінага свету пры Прэзідэнце. «Так, гэта Дзяржінспекцыя абсалютна незалежная, кантралюе і вас, і іншых, але вы павінны наладзіць партнёрскія адносіны з ёю з карысцю для нашага грамадства і для нашай дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўніку дзяржавы было таксама даложана аб выніках дзейнасці БТПР за 2011 год, планах на перспектыву.

Прэзідэнт звярнуў пільную ўвагу на павышэнне эфектыўнасці вядзення паляўнічых гаспадарак на тэрыторыі Беларусі, а таксама рацыянальнага і беражлівага выкарыстання прыродных рэсурсаў. Аляксандр Лукашэнка даручыў навесці належны парадак ва ўсіх гэтых сферах. У структуры РДГА налічваецца 104 паляўнічыя гаспадаркі, дзе працуюць каля 900 чалавек.

Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу на неабходнасць развіцця ў краіне замежнага паляўнічага турызму і стварэння адпаведных умоў для прыцягнення ў Беларусь аматараў гэтага віду адпачынку. Як далажыў Юрый Шумскі, у 2011 годзе даход ад замежнага паляўнічага турызму ў параўнанні з 2010 годам вырас удвая, за апошні год таварыствам зароблена каля 700 тыс. еўра.

КНІЖНЫ ДУХ

2012 ГОД КНІГІ

Стэнды, паліцы, вітрыны з кнігамі, шапікі, часам нават хутчэй павільёны — на Міжнароднай кніжнай выставе ў «БелЭкспа» на некалькі дзён пасяліліся кнігі. Такое адчуванне, што ў іх тут прызначана свая «тусоўка», тут яны сабраліся на баль, а калі больш правільна — то выйшлі ў людзі. Людзі гэта ацанілі: хоць і кажуць, што цікавасць да кніг знікаецца (сусветная тэндэнцыя), але насамрэч выстава — гэта ўнікальная магчымасць пазнаёміцца за адзін дзень і ў адным месцы з кніжнай прадукцыяй самых розных выдавецтваў (прычым не толькі беларускіх). І нават набыць кнігі, якія толькі што выйшлі ў друк, адчуць асаблівы пах, гартаючы старонкі.

— Штогод прыходжу на кніжную выставу-кірмаш, асабліва мяне цікавяць выданні, прысвечаныя мастацтву, — гаворыць мастак і школьны настаўнік Дзмітрый Ярмілаў. — Зручна, калі ёсць магчымасць паглядзець прадукцыю розных краін. Да таго ж тут больш даступныя кошты.

Кнігі — як людзі: ёсць сярод іх нібыта чараўнікі — завабліваюць пахам таямнічасці, гартаючы іх, шукаеш здзіўлення і адкрыцця. А бываюць прыгожыя, у якіх хочацца пашукаць лёгкасці быцця. А бываюць сур'ёзныя, важкія, за якімі стаіць багатая гісторыя стварэння, і часам за іх пахам ты можаш адчуць няпросты лёс.

Кнігай з багатым лёсам можна лічыць, напрыклад, выданне «Чалавек, ператвораны ў ваўка» Сяргея Пясецкага, якую выпусціла выдавецтва «Регистр» ужо ў 2012 годзе. Праўда, у перакладзе з польскай на рускую. Але гэта свайго роду сведчанне цяжкага лёсу беларуса-заходніка Сяргея Пясецкага, які пачаў пісаць у польскай вязніцы па-польску, але быў у 1938 годзе намінаваны на Нобелеўскую прэмію па літаратуры. На жаль, імя гэтага пісьменніка больш вядомае знаўцам літаратуры. Цяпер ёсць магчымасць пазнаёміцца з жыццём Заходняй Беларусі больш шырокім колам чытачоў...

Дарэчы, ёсць магчымасць для сустрэч падчас выставы з сучаснымі аўтарамі: яны прыходзяць самі, падпісваюць кнігі, як напрыклад Ганна Батракова, аўтарка папулярных кніжак.

Але ж хто мог сабе ўявіць, што вялікую колькасць народу здольная прывабіць прэзентацыя кніг, якія больш арыентаваны на спецыялістаў, як напрыклад, «Гісторыя сусветнага мастацтва. Рускае і беларускае мастацтва XIX — пачатку XX стагоддзя» выдавецтва «Беларусь». Ці кніга «Экран і культурная спадчына Беларусі», якую выпусціла выдавецтва «Беларуская навука».

— Па сутнасці, гэта калектыўная манаграфія, — адзначае аўтар канцэпцыі гэтага выдання, кандыдат мастацтвазнаўства Антаніна Карпілава. — Мы хацелі паказаць, што культурная спадчына Беларусі — гэта не толькі сівая даўніна, фальклор, традыцыі ды гістарычныя помнікі, пра якія, безумоўна, ўсе мы павінны ведаць. Культурная спадчына — гэта і іншыя віды мастацтваў, якія напрацавалі сваю спадчыну. Гэта і жывыя людзі, у тым ліку тыя творцы і майстры, якія стваралі беларускую экранную культуру, якія давалі магчымасць убачыць і самім жыхарам краіны, і ўсяму свету вобраз Беларусі. Гэта і кінематограф, і тэлебачанне, відэамастацтва. Кажуць, што сёння культурны слой станчаецца. Менавіта таму важнасць культуры ўзрастае. Культура ратуе як чалавека, так і ўсё грамадства ад паўсядзённасці, руціны. Бо што ёсць культура: любоў да мінулага і трывога за будучыню.

Паглядзець на свежаспечаны зборнік, які рыхтаваўся навукоўцамі, экспертамі ў галіне кіно, і выспеў у Акадэміі навук, сабралася шмат людзей. Не дзіва: кіно — папулярная тэма. Адна са стратэгічных ліній у дзяржаўнай культурнай палітыцы. Кіно любяць глядзець усе. І тых, хто прадстаўляе кіно, таксама вельмі любяць. Напрыклад, Уладзімір Мароз, галоўны рэдактар студыі «Летапіс», учора быў двойчы герой на выставе. Акрамя ўдзелу ў гэтай прэзентацыі, яшчэ і прадстаўляў уласную кніжку вершаў «Шляхцянка-Восень», прысвечаную каханай жонцы Вользе. Народны артыст Беларусі Аляксандр Ткачонак таксама прыйшоў на выставу: ён нядаўна сыграў адметную ролю святара ў фільме «Прытчы», імкнецца засведчыць духоўную лінію ў беларускім кіно. Як і старэйшы беларускі кінавед Анатоль Красінскі, які ў сярэдзіне 50-х прыехаў у нашу краіну і быў сведкам стварэння вялікіх кінаработ на айчыннай кінастудыі. Ён, дарэчы, лічыць, што без пісьменнікаў Быкава і Караткевіча беларускі кінематограф мог бы не адбыцца.

Усё ж мастацтва нясе думку. Думкі фармулюе літаратура. Сёння да галоўных тэм, якія прагучалі ў беларускай літаратуры, будуць звяртацца шмат: юбілеі Купалы, Коласа, Танка. Пра іх традыцыі разважаюць падчас выставы на «круглых сталах», дыскутуючы аб тым, якім шляхам нашай кніжнай культуры рухацца ў XXI стагоддзі. Таму што, нягледзячы ні на што, у людзей ёсць жаданне набываць і чытаць кнігі. І добра, што для гэтага ёсць розныя выдавецтвы, якія прапануюць розныя кніжкі. Дасведчаны чытач знойдзе сваю.

Людзі гартаюць кніжкі. Выбіраюць. Напэўна ж, не ад таго, што вабіць водар старонак, а ад таго, што хочацца адчуць водар думак.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Неабходна павышаць стымулюючую ролю заработнай платы

10 лютага адбылося пасяджэнне калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, на якім былі разгледжаны вынікі работы сістэмы міністэрства ў 2011 годзе і вызначаны задачы на 2012 год, а таксама сярэдне- і доўгатэрміновыя перспектывы.

Гаворка ішла аб дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне, занятасці насельніцтва, стварэнні бяспечных умоў працы, пенсійнай сістэме, аплаце працы работнікаў, сямейнай палітыцы дзяржавы, сацыяльнай падтрымцы неабароненых слаёў насельніцтва і іншых накірунках працы міністэрства. Ніжэй мы прыводзім самыя актуальныя тэмы, якія знайшлі адлюстраванне на пасяджэнні калегіі.

Беларусаў павінна быць больш

У 2011 годзе была прынята Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь да 2015 года. Сёння, па словах міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяны Шчоткінай, ужо можна казаць пра яе першыя вынікі. У краіне нарадзілася на 1300 дзяцей больш, чым у 2010 годзе — гэта самы высокі паказчык за апошнія 10 гадоў. Але, нягледзячы на некаторае зніжэнне тэмпаў дэпапуляцыі, колькасць насельніцтва рэспублікі працягвае памяншацца. Пры гэтым вострай застаецца праблема смяротнасці насельніцтва ў працаздольным узросце.

Дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне надаў увагу і віцэ-прэм'ер Анатоль Тозік, які прысутнічаў на калегіі. Ён выказаў асцярогу, што, нягледзячы на нядрэнныя вынікі мінулага года, спыніць зніжэнне колькасці насельніцтва будзе складана. Разам з тым, на думку Анатоля Тозіка, рэзервы ёсць. У першую чаргу гаворка ідзе пра зніжэнне смяротнасці ад знешніх прычын (самагубствы, утапленні, атручванні, гібель людзей у выніку пажараў, дарожна-транспартных здарэнняў і г.д.).

Распрацоўваецца канцэпцыя развіцця пенсійнай сістэмы

Старэнне насельніцтва вылучае новыя патрабаванні да гэтага сацыяльнага інстытута. У першую чаргу, як заявіла міністр працы і сацыяльнай абароны, гаворка ідзе пра стварэнне больш прывабных умоў для асоб, якія адклалі прызначэнне пенсіі па ўзросту на больш позні тэрмін альбо працягнулі працаваць пасля прызначэння пенсіі, адмовіўшыся ад яе атрымання. Такі падыход дазволіць у перыяд працягу працоўнай дзейнасці аўтаматычна павялічваць памер пенсіі.

На 1 студзеня 2012 года ў рэспубліцы налічвалася 2 млн 486,9 тыс. атрымалнікаў розных відаў пенсій у органах па працы, занятасці і сацабароне. Толькі за 2011 год іх колькасць павялічылася на 18 тыс. чалавек. Рэзкі рост колькасці насельніцтва ў старэйшых узростах патрабуе значнага павелічэння выдаткаў на пенсійнае забеспячэнне. Тым не менш, пенсійная сістэма сёння функцыянуе стабільна, пенсіі выплачваюцца своечасова.

Разам з тым, як заявіла Марыяна Шчоткіна, запас трываласці Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва знізіўся: калі на 1 студзеня 2011 года за кошт рэшткаў сродкаў можна было забяспечваць выплату пенсій за 5 месяцаў, то цяпер — менш за 4 месяцы.

Прыярытэты ў палітыцы занятасці

На 1 студзеня гэтага года колькасць свабодных працоўных месцаў (51,7 тыс. вакансій) у 1,8 раза перавышала колькасць беспрацоўных (28,2 тыс. чалавек), а ў Мінску — у 6 разоў. Вынікі 2011 года і сённяшнія тэндэнцыі на рынку працы даюць падставы думаць, што рэзкага пагаршэння сітуацыі на рынку працы рэспублікі ў бягучым годзе не будзе.

Урадам прынята Дзяржаўная праграма садзейнічання занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь. На 2012 год прыярытэты ў палітыцы занятасці змяшчаюцца ў бок павышэння эканамічна эфектыўнай занятасці. З улікам гэтага асноўнай мэтай дзяржпраграмы вызначана павышэнне эфектыўнасці выкарыстання працоўных рэсурсаў і канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы на рынку працы.

Новыя ўмовы аплаты працы ў бюджэтнай сферы

Цяпер праводзіцца работа па кардынальным удасканаленні заканадаўства ў галіне аплаты працы. «Мы гаворым пра тое, што рынак працы стабільны і ўзровень беспрацоўя складае ўсяго 0,6%, але разам з тым выдатна разумеем, што адкрытыя межы ставяць перад намі задачы ўтрымаць высокакваліфікаваныя кадры, і не толькі рэальнага сектара эканомікі, але і бюджэтнай сферы. Таму неабходна разгледзець новыя крокі па аплаце працы ў бюджэтнай сферы», — заявіла міністр працы і сацабароны.

«У бюджэтнай сферы асноваў застаецца бюджэтная сетка, тарыфная стаўка першага разраду. Ва ўрадзе ёсць планы па павышэнні тарыфнай стаўкі першага разраду, але задачы зараз іншыя, — лічыць Марыяна Шчоткіна. — Трэба зрабіць так, каб надтарыфная стымулюючая частка была аб'яднаная і была ў руках наймальніка — для таго, каб за яе кошт стымуляваць работніка, які якасна працуе».

Святлана БУСЬКО.

Платнае навучанне: КОШТЫ — Ў ЗАЛЕЖНАСЦІ АД СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

31 лютага ўсе дзяржаўныя ВНУ пераглядаюць свае цэннікі на падрыхтоўку спецыялістаў на платнай аснове, што звязана з рашэннямі ўрада аб павелічэнні тарыфнай стаўкі першага разраду і павышэнні тарыфных акладаў педагагічным работнікам з ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу без вучонай ступені ці вучонага звання. Між іншым, гэта ўжо трэцяе з пачатку навучальнага года павышэнне кошту платнага навучання.

Адным з першых новы кошт падрыхтоўкі спецыялістаў на платнай аснове агучыў Белдзяржуніверсітэт. На асобных спецыяльнасцях БДУ кошт навучання перавышаў 9,3 мільёна рублёў яшчэ пасля апошняга павышэння цэн, якое адбылося ў лістападзе. Але ўжо ў лютым цэннікі на самых дарагіх і прэстыжных спецыяльнасцях перасягнулі планку ў 12 мільёнаў рублёў. Так, напрыклад, 12 млн 67 тысяч рублёў вымушаны будуць плаціць за сваё навучанне цяпер студэнты першага курса дзённай формы навучання эканамічнага, юрыдычнага факультэтаў, факультэта міжнародных адносін, а таксама студэнты некаторых спецыяльнасцяў Інстытута журналістыкі, гуманітарнага, філалагічнага факультэтаў і факультэта філасофіі і сацыяльных навук. На механіка-матэматычным факультэце, ФПМІ, факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, фізічным, хімічным, геаграфічным факультэтах кошт навучання перасягнуў 10 мільёнаў рублёў, на біялагічным факультэце — 11 мільёнаў рублёў. А самымі «таннымі» для першакурснікаў застаюцца ў БДУ спецыяльнасці «беларуская філалогія», «руская філалогія», «славянская філалогія» і «сацыяльная работа» — 8 млн 683 тысячы рублёў. Фактычна на ўсіх спецыяльнасцях кошт навучання павысіўся ад 2,2 да 2,7 мільёна рублёў.

Як падкрэсліваецца ў тлумачальнай запісцы да загада аб павышэнні кошту падрыхтоўкі спецыялістаў на платнай аснове, у студзені рост заработнай платы склаў у БДУ 45,6%, у тым ліку заработная плата прафесарска-выкладчыцкага складу павялічылася на 48,1%. Рост выдаткаў на заработную плату ў цане склаў 45,6%. А выдаткі на аплату камунальных паслуг і іншыя засталіся на ўзроўні лістапада 2011 года.

Улічваючы сацыяльную значнасць паслугі і рэкамендацыі Міністэрства адукацыі, рост кошту платнага навучання ў параўнанні з дзейнай цаной на дзённай і завочнай форме навучання не перавысіў 29%.

«Недапушчэнне росту цаны больш чым на 29% было дасягнута шляхам зніжэння ўзроўню рэнтабельнасці, — сцвярджаюць у БДУ. — На дадзены момант «вага» заработнай платы і налічэнняў на заработную аплату ў калькуляцыі навучання складае 88,4%. Удзельная вага камунальных выдаткаў — 8,9%, іншых выдаткаў — 2,7%. Такім чынам, сярэдняя рэнтабельнасць на завочнай форме навучання складае 4%, а на дзённай — 0%».

Трэба дадаць, што ўзровень аплаты ў канкрэтнай ВНУ можа залежаць ад спецыяльнасці, якую атрымлівае студэнт, кваліфікацыі, стажу работы прафесарска-выкладчыцкага складу і іншых педработнікаў, а таксама стану матэрыяльна-тэхнічнай базы. Традыцыйна самай дарагой (прычым не толькі ў нас, але і ва ўсім свеце) з'яўляецца вышэйшая медыцынская адукацыя. Але кошт навучання ў БДУ літаральна наступае платнай падрыхтоўцы медыкаў на пяты.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

10-этажного 2-секционного 45-квартирного жилого дома № 2 по генплану объекта: «Многоэтажные жилые дома (не относящиеся к домам повышенной комфортности) со встроенными помещениями общественного назначения и подземными гаражами-стоянками в районе жилой застройки в квартале ул. Комаровское кольцо – пер. Восточный – ул. Корш-Саблина – ул. Восточная в г. Минске»

Общество с ограниченной ответственностью «Студенческий дом» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства.

Информация о застройщике

ЗАСТРОЙЩИК (заказчик) – ООО «Студенческий дом».

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от **07.09.2000 № 1030** в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за **№ 100037170**.

Адрес застройщика: 220040, г. Минск, ул. Восточная, д. 39, помещение 1Н, кабинет № 16, телефон/факс: 292 53 67.

Режим работы: понедельник-пятница с 8.45 до 17.30, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение предыдущих трех лет предприятие построило:

- жилые дома по ул. Корш-Саблина;
- жилой дом по ул. Гало, 8.

Информация о проекте строительства

Цель строительства – исполнение инвестиционного проекта по строительству объекта: **«Многоэтажные жилые дома (не относящиеся к домам повышенной комфортности) со встроенными помещениями общественного назначения и подземными гаражами-стоянками в районе жилой застройки в квартале ул. Комаровское кольцо – пер. Восточный – ул. Корш-Саблина – ул. Восточная в г. Минске». Жилой дом № 2 по генплану.**

Общая площадь квартир в жилом доме № 2 по генплану – 3377,92 м², жилая площадь квартир – 1855,57 м².

Договоры долевого строительства будут заключены на строительство 15 квартир в 10-этажном 45-квартирном кирпичном жилом доме № 2 по генплану (количество однокомнатных квартир – 2; двухкомнатных квартир – 8; трехкомнатных квартир – 5).

Стоимость 1 кв.м общей площади по СНБ квартир составляет 1 200 долларов США по курсу НБ РБ, что в эквиваленте на 01.02.2012 составляет 9 948 000 белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

Также к заключению договоров долевого строительства предлагаются 3 административных помещения на 1-ом этаже.

Стоимость 1 кв.м в административных помещениях составляет 1 200 долларов США по курсу НБ РБ, что в эквиваленте на 01.02.2012 составляет 9 948 000 белорусских рублей. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи, подвалы и другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность Дольщиков, если финансирование строительства этих объектов производилось всеми Дольщиками, и передаются Застройщиком по акту приемки-передачи представителю товарищества собственников.

Застройщиком получены:

- решение Мингорисполкома от 16.06.2011 № 1617;
- разрешение на производство строительно-монтажных работ Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 24.10.2011 № 2-207Ж-020/11;
- экспертное заключение ДРУП «Госстройэкспертиза по городу Минску» от 01.06.2009 № 0331-8-2009;
- экспертное заключение ДРУП «Госстройэкспертиза по городу Минску» от 20.05.2011 № 379-60/11.

Застройщику выделены земельные участки общей площадью 0,1242 га и 0,4263 га, свидетельства (удостоверения) № 500/718-11838 от 15.09.2011 и № 500/718-11837 от 15.09.2011 выданы Республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Начало строительства – IV квартал 2011 г.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию строящегося дома – II квартал 2013 года.

Подрядчиком по строительству объекта является ООО «Стройтехпроминвест».

Ознакомление дольщиков с объектом долевого строительства и условиями заключения договоров на строительство производится по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 39, пом. 1Н, каб. № 16, тел. 292 53 67.

Як прыцягнуць маладых спецыялістаў у пацярпелыя ад ЧАЭС рэгіёны?

Кадравую праблему на пасяджэнні выніковай калегіі закрануў начальнік Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС МНС Беларусі Уладзімір ЧЭРНІКАЎ. У прыватнасці, гаворка ішла пра дэфіцыт медыцынскіх работнікаў.

Так, паказчык укамплектаванасці ўрачамі істотна знізіўся ў Брэсцкай і Магілёўскай абласцях, да 76 і 67% адпаведна. Больш актыўна едуць спецыялісты ў белых халатах на Гомельшчыну. Аднак і там сітуацыя ў асобных раёнах — Лоеўскім, Чачэрскім, Ельскім і Хойніцкім — не вясёлкавая: укамплектаванасць урачамі складае ад 47 да 58%.

— Зарэтушаваць праблему можна, — лічыць Уладзімір Чэрнікаў, — падтрымліваючы сумяшчальніцтва. Але гэта прывядзе да зніжэння якасці абслугоўвання і яшчэ большых чэргаў у бальніцах і паліклініках.

Гэтага нельга дапусціць. Таму дэпартамент будзе і далей падтрымліваць будаўніцтва жылля для спецыялістаў пацярпелых рэгіёнаў.

— Праўда, як бачым, і наяўнасць жылля сёння не выратоўвае сітуацыю, — адзначыў начальнік дэпартамента. — Людзям патрэбны больш прывабныя ўмовы жыцця. Менавіта павышэнне ўзроўню жыцця ў пацярпелых рэгіёнах, на мой погляд, дазволіць вырашыць кадравую праблему. Прычым не толькі па ўрачах.

Для таго, каб зрабіць названыя рэгіёны больш прывабнымі для спецыялістаў розных профіляў, ствараюцца новыя вытворчасці. Паводле слоў спадара Чэрнікава, на рэалізацыю спецыяльных інавацыйных праектаў у 2011 годзе зарасходавана 49 млрд рублёў, у тым ліку: у Брэсцкай вобласці — 6,9 млрд рублёў, у Гомельскай — 31,5 млрд рублёў, у Магілёўскай — 10,9 млрд рублёў.

— Мінулы год у сувязі з сітуацыяй у эканоміцы нашай краіны, — падкрэсліў Уладзімір Чэрнікаў, — быў няпростым. Грошы, прадугледжаныя Дзяржаўнай праграмай па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, былі выдзелены і асвоены ў поўным аб'ёме. Аднак падзенне курсу беларускага рубля і звязанае з гэтым павышэнне цэн прывяло да скарачэння фізічных аб'ёмаў выкананых работ і паслуг.

Так, на Брэстчыне распачата рэалізацыя 5 праектаў. На сёння ж з іх завершаны толькі адзін: створана вытворчасць вырабаў з паперы на базе Столінскага райспажыўтаварыства «Столінаптгандаль» коштам 300 млн рублёў. З 13 праектаў на Гомельшчыне таксама скончаны і запушчаны толькі адзін кандытарскі цэх у Брагіне.

Адзін з прыярытэтных кірункаў Дзяржпраграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС — сацыяльная абарона. Летась у дэпартамент скаргаў на парушэнне ўстаноўленых заканадаўствам патрабаванняў па гэтым кірунку не паступала. Пацярпелым у поўным аб'ёме выплачаны льготы і кампенсацыі на суму 287,7 млрд рублёў.

— Варта адзначыць, што гэты сучасны цэх з'явіўся ў тым ліку і за кошт прыцягнутых сродкаў, — падкрэсліў **першы намеснік начальніка Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Анатоль ЗАГОРСКІ.** — З Брагінскага райвыканкама, які ў гэтых цяжкіх умовах знайшоў магчымасць прыцягнуць дадатковыя сродкі і не «напружваць» дзяржаўны бюджэт, варта браць прыклад і іншым.

Тэрміны ж завяршэння астатніх праектаў з-за падаражання імпартнага абсталявання перанесены аблвыканкамамі на 2012 год. Сярод іх — расшырэнне цэха па перапрацоўцы насення рапсу на базе ААТ «Брагінаграсэрвіс», укараненне канадскай тэхналогіі па вытворчасці асфальтабетонных сумесяў для рамонту дарожных пакрыццяў на базе ДРСУ-185 у Ветцы, мадэрнізацыя асфальтабетоннага завода на базе ДРСУ-173 у Магілёўскай вобласці і інш.

— Вялікія спадзяванні ўскладаюцца і на стварэнне сучасных прадпрыемстваў па вытворчасці рыб каштоўных парод у Быхаўскім і Касцюковіцкім раёнах, — адзначыў Анатоль Загорскі. — Яны скіраваны на тое, каб зрабіць у тым ліку і той самы заморскі лосось даступным для беларусаў.

Паводле слоў прадстаўнікоў дэпартамента, сёлета «плануецца наверстаць упушчанае і выйсці на тыя паказчыкі, якія прадугледжаны Дзяржаўнай праграмай па пераадоленні наступстваў Чарнобыльскай катастрофы».

Напрыканцы свайго выступу спадар Чэрнікаў папрасіў старшыняў Брэсцкага, Гомельскага і Мінскага аблвыканкамаў да канца 2012 года забяспечыць усіх інвалідаў-чарнобыльцаў жыллём.

— У 2010 годзе на пасяджэнні калегіі дэпартамента было прапанавана да 25-годдзя катастрофы на ЧАЭС забяспечыць жыллём усіх інвалідаў-чарнобыльцаў, — нагадаў начальнік дэпартамента. — Тады іх было 128 чалавек. Прапанову падтрымаў Савет Міністраў. Аднак цалкам гэта праблема вырашана толькі Мінгарвыканкамам, Магілёўскім і Віцебскім аблвыканкамамі.

Надзея ДРЫЛА.

ЯКОЙ БУДЗЕ ЕЎРОПА ЗАЎТРА?

Лекцыя «Еўразійскі саюз — адзіны шанц Расіі на выжыванне», якая адбылася ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь выклікала шырокі рэзананс. «Звязда» прапануе пазнаёміцца з найбольш цікавымі часткамі выступу Андрэя Фурсава, дырэктара Цэнтра рускіх даследаванняў Маскоўскага гуманітарнага ўніверсітэта.



Вучоны вылучыў з мінулага года тры найбольш значныя, на яго думку, падзеі. Гэта «арабская вясна», пад'ём Германіі ва ўмовах крызісу еўразоны і «Нарвежскі расстрэл». Андрэй Фурсаў упэўнены, што гэтыя тры факты цесна звязаныя паміж сабою. Паглядзім на яго разважанні.

Навошта была «арабская вясна»?

«Вядома, што хваляванні не ўзнікаюць на пустым месцы, з нічога. Такая маштабная макрарэгіянальная з'ява, як «арабская вясна», патрабуе вельмі сур'ёзнай, працяглай падрыхтоўкі. Арабскую благасферу «бамбілі», падрыхтоўвалі грамадскую думку некалькі гадоў», — лічыць эксперт. На яго погляд, Злучаныя Штаты «перанапружыліся» ў першае дзесяцігоддзе XXI стагоддзя і аказаліся прыкладна ў тым жа становішчы, у якім і Рымская імперыя ў часы Траяна, калі Рым ад стратэгічнага наступу перайшоў да стратэгічнай абароны і пачаў будаваць валы, сцены і гэтак далей. ЗША хочацца сысці з Блізкага Усходу ў той якасці, у якой былі раней. Аднак паглядзіце: калі мы сыходзім з рэгіёна, яго пакідаем канкурэнтам? Не. Выйсці трэба так, каб канкурэнт не скарыстаўся самім выхадам і перабудовай сістэмы кіравання. А для гэтага неабходна стварыць кіраваны хаос на той тэрыторыі, якую вы пакідаеце. І ў хаосе, «у каламутнай вадзічцы, палавіць рыбку». Хто найлепшы прэтэндэнт на стварэнне хаосу ў мусульманскім свеце? «Гэта ісламісты, — лічыць Андрэй Фурсаў. — Толькі на першы погляд здаецца, што яны ворагі ЗША. У транснацыянальных карпарацый і ісламістаў адзіны вораг — нацыянальныя дзяржавы. Можа быць, калі-небудзь яны схопяцца паміж сабою, але пакуль у іх агульны вораг». Таму і былі арганізаваны рэвалюцыі праз «Твітар» і «Фэйсбук». «Паўночнай Атлантыцы» вельмі хочацца ўсталяваць кантроль над Еўразіяй, каб перамагчы галоўных геапалітычных канкурэнтаў — Кітай і Расію. Шлях праз Блізкі Усход не самы дрэнны.

Час імперападобных утварэнняў

«Сёння трашчыць па швах неаліберальная мультыкультурная Еўропа, — падкрэслівае вучоны. — І ў ёй яскрава вылучаецца постнеаліберальны лідар — Германія. У 2012-13 гадах тая Еўропа, якая сфарміравалася ў момант разбурэння Савецкага Саюза, ужо існаваць не будзе...» На думку Фурсава, сусветны эканамічны крызіс — гэта, па сутнасці, крызіс глабалізацыі. Яна сябе вычарпала. Што можа стаць альтэрнатывай глабалізацыі і глабальнай сістэме? «Гэта павінны быць цэнтры постглабальнай крышталізацыі ўлады і багацця, якія не з'яўляюцца глабальнымі, але ў той жа час большыя за нацыянальныя дзяржавы. Гэта павінны быць блокі з насельніцтвам не менш за 300 мільёнаў чалавек, каб забяспечыць эканамічную выжывальнасць. Вонкава гэта будзе выглядаць як распад глабальнай сістэмы і адраджэнне старых імперый. Аднак насамрэч гэта будуць толькі «імперападобныя ўтварэнні». Я вынайшаў для абазначэння менавіта такі тэрмін», — сцвярджае эксперт. Адным з такіх цэнтраў можа стаць Германія. Яна ідзе ў авангардзе адраджэння Еўропы, у любым выпадку, яе цэнтральнай часткі. Але стварэнне імперападобнага ўтварэння з ядром у Германіі вырашыць адны праблемы і народзіць іншыя. У тым ліку для Расіі. Неабходна ствараць сваё аналагічнае імперападобнае ўтварэнне. «Ім можа стаць Еўразійскі саюз», — запэўнівае Андрэй Фурсаў. На яго думку, час імперый у старым сэнсе і нацыянальных дзяржаў прайшоў — павінны быць новыя структуры. Перадзел улады ўжо пачынаецца

Першым знакам гэтага Андрэй Фурсаў лічыць страшную бойню Андэрса Брэйвіка ў Нарвегіі летам мінулага года і беспарадкі ў Англіі. «Думаю, гэты расстрэл у Нарвегіі і пагромы ў Вялікабрытаніі звязаны. Усё гэта з'яўляецца паведамленнем адных уладных вярхоў свету іншым. Брэйвік быў не адзін, за ім стаяць яшчэ людзі». Вучоны сцвярджае, што гэта пачатак барацьбы паміж двума шляхамі далейшага развіцця сусвету — тым, які існуе зараз, і тым, які будзе створаны нанова (тыя самыя імперападобныя ўтварэнні).

Вынікі

А ў выніку мы маем некалькі супярэчнасцяў, мяркуе эксперт:

— паміж антылібералнай і неалібералнай стратэгіяй развіцця сусветных вярхоў;

— паміж тэндэнцыямі глабалізацыі канца XX стагоддзя і імперападобнымі ўтварэннямі, якія прабіваюць сабе шлях;

— канфлікт паміж дзяржбюракратыяй і фінансавым капіталам, а адпаведна і з сеціўнымі, але неаордэнскімі структурамі, што стаяць за імі;

— канфлікт паміж ЗША і Кітаем;

*— канфлікт унутры істэблішменту (грамадска-палітычныя колы, арганізацыі і гэтак далей, якія займаюць высокія пазіцыі ў палітычнай іерархіі, уплываюць на палітычнае, эканамічнае і грамадскае жыццё, фарміруюць грамадскую думку. — **Аўт.**) найбуйнейшых краін, у тым ліку ў* ЗША.

Адзіным выйсцем для Расіі і яе суседзяў (а значыць, і для нас, Беларусі) з гэтай складанай сусветнай геапалітычнай сітуацыі Андрэй Фурсаў называе стварэнне Еўразійскага саюза, які дазволіць супрацьстаяць іншым аналагічным утварэнням.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ШУКАЛІ МЕДЫКІ, ШУКАЛА МІЛІЦЫЯ...

Для выратавання чалавека быў задзейнічаны нават усюдыход «Радзіян»

Гэты выпадак адбыўся ў Гомелі бліжэй да 15 гадзін дня: супрацоўнік гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі перадаў выратавальнікам, што па тэлефоне «103» папрасіў дапамогі чалавек, які не назваў сябе.

— Ён толькі сказаў, што знаходзіцца

Арт-прастора

БАЦЬКОЎСКАЯ ШКОЛА

Творчая сям'я на апошняй выставе Мікалая Казлова «Todo Fantasus». Злева направа: Павел Сустаў, Наталля Сустава, Мікалай Казлоў, Раман Сустаў, Любоў Абрамава.

Мастак Раман Сустаў, сын вядомых кніжных графікаў Мікалая Казлова і Наталлі Суставай, распавёў, ці лёгка гэта быць часткай творчай дынастыі, як справы на рынку кніжнай графікі нашай краіны і якія ілюстрацыі сёння практычна «вымерлі».

На 51-м Нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі», вынікі якога абвясцілі днямі ў Мінску, дыпломам пераможцы ў персанальнай намінацыі «Майстэрства» пасмяротна ўзнагародзілі мастака-графіка Мікалая Казлова — за асабісты ўнёсак у развіццё кніжнай культуры Беларусі. «Звязда» паразмаўляла з сынам мастака Раманам Суставым, які атрымаў мастацтва «ў спадчыну» і з годнасцю працягвае справу свайго бацькі.

— Мікалай Раманавіч стаяў ля самых вытокаў беларускай кніжнай графікі. Вы ўсведамляеце сябе пераемнікам яго досведу?

— Так, адчуваю і разумею, што ён сапраўды быў адным з піянераў

Ілюстрацыя Мікалая Казлова да казкі Э. Т. А. Гофмана. «Залаты гаршчок». 1994.

беларускай ілюстратарскай школы. Прыемна чуць, калі гавораць, што тата быў менавіта тым свежым павевам, які цалкам абнавіў тутэйшую паліграфію. У 1973 годзе ён скончыў Маскоўскі паліграфічны інстытут, а Масква ў тыя часы давала вельмі цікавую паліграфічную адукацыю — рыхтаваліся шырокаканікіраваныя мастакі, вялікія прафесіяналы. Зараз наша Акадэмія рыхтуе толькі ілюстратараў, або толькі дызайнераў. Там жа навучалі спецыялістаў, якія цалкам ведалі тэхналагічны працэс. Ведалі, як робіцца кніга: макет, пераплёт. Я памятаю час, калі тата вылічваў макет уручную пры дапамозе спецыяльнай лінейкі (камп'ютараў яшчэ не было) — гэта тытанічная праца! У Беларусі тады якраз складвалася свая школа — Паплаўскі, Кашкурэвіч, Савіч, Кліменка. Таму беларуская школа была вельмі яскравай. Былі брэндавыя выдавецтвы, кшталту «Юнацтва». І вельмі шкада, што яго зліквідавалі. Бо цяпер любое новае выдавецтва з новай назвай павінна наноў заяўляць пра сябе на міжнародным рынку. Еўрапейскія выдавецтвы такога ўзроўню прэстыжу, як наша «Юнацтва», пакінулі свае назвы.

— Раман, вы таксама займаецеся кніжнай графікай. Чаму вы навучыліся ў бацькі і ў чым хацелі яго аспрэчыць як творца?

— Бацькоўская школа — асноўная. Гэта тое, чаму не вучаць, але што ўваходзіць у падсвядомасць. Я з самага ранняга дзяцінства бачыў тату за працай. Вобраз чалавека, які пастаянна працуе, шукае, застаўся на ўсё жыццё. Бацька на мяне вельмі паўплываў. Спачатку гэта былі нейкія простыя парады блізкага чалавека, якія я з-за маладой экспрэсіі ўспрымаў у штыкі. Але праз некаторы час сур'ёзна асэнсоўваў. Так заўжды бывае ў дзяцей. Наогул, многія глядзяць на мае працы і ўзгадваюць татавы. Кажуць, што я менавіта той яблык, які ўпаў недалёка ад дрэва. У добрым сэнсе. Я стараюся пераасэнсоўваць бацькаў вопыт. Але захапленне літаратурнымі вобразамі ў нас з ім заўжды перагукалася. Таму я часам наўмысна браўся ілюстраваць кнігі, якія ўжо ілюстраваў мой тата.

Пераемнасць пакаленняў. Сын пераасэнсоўвае вопыт бацькі.

Ілюстрацыя Рамана Сустава да казкі Э. Т. А. Гофмана. «Залаты гаршчок». 2002.

— Ваш бацька шмат кніг афармляў разам з маці. Цікавае спалучэнне асабістых і творчых стасункаў. Як яны спрацоўваліся разам?

— Наогул, гэта бывае надзвычай рэдка, каб мастакі працавалі разам. Кожны мастак — эгаіст, мае свае ідэі, хоча самарэалізацыі. А мае бацькі супалі ў ментальным плане, выдатна працавалі. Прычым часам вельмі шчыльна і доўга над адным праектам. Напрыклад, калі афармлялі школьныя падручнікі. Гэта быў добры сімбіёз — кожны рабіў тое, што лепш умеў. Мама разумела, што тата ўмее зрэжысіраваць кнігу: ідэя, фармат, стыль ілюстрацый, кампазіцыя. Тата разумеў, што мама добрая маляваль-шчыца — яна «ставіла» фігурам рукі, рабіла рухі натуральнымі. Ён больш фантазіраваў, а яна дадавала рэальных рэчаў: драпіроўкі, складкі. Памятаю, калі тата пачынаў працаваць, ён замыкаўся ў майстэрні і тыдні два думаў над архітэктурай кнігі, збіраў матэрыялы, прыдумляў канцэпцыю. Потым падключалася мама, яна прапрацоўвала ілюстрацыі ў алоўку. Былі ў нас нават сямейныя сходы, калі ілюстрацыі выкладваліся на невялікай плоскасці, напрыклад, на канапе, і кожны, уключаючы майго малога сына, выказваў сваю думку. Я пра такое супрацоўніцтва больш не чуў. Хіба што ёсць вядомыя ўкраінскія мастакі Вольга і Андрэй Дугіны — таксама сямейная пара. І, бадай, усё.

— А над чым вы самі цяпер працуеце?

— На жаль, зараз не атрымліваецца працаваць выключна ў кніжнай ілюстрацыі. У Беларусі арт-рынак стаў вельмі слабым, дакладней, выдавецтвы радзей заказваюць і аплачваюць ілюстрацыі. Без працы на замежных кліентаў мастаку вельмі складана выжыць у Беларусі. Да таго ж, з-за памяншэння ганарараў пачаўся адток добрых мастакоў з кніжнай графікі, адпаведна вельмі ўпаў узровень кніжнага афармлення. Гэта асобная вялікая тэма. Але я ўсё адно працягваю працаваць з кнігай. Зараз працую з адным са сваіх улюбёных беларускіх пісьменнікаў Валянцінам Маслюковым. У выдавецтве «Літаратура і Мастацтва» мы выпускаем яго прыгодніцкія раманы, з серыі «Нараджэнне чараўніцы». Спачатку творы выходзілі агульным томам у Маскве. А ў Беларусі мы падзялілі гэта на асобныя кнігі, усяго іх будзе шэсць. Выйшла ўжо дзве. Абедзве цалкам раскупілі. Нам сказалі, што такога ў апошні час наогул не было.

Яшчэ я працую з кніжным знакам — экслібрысам. Займаюся тым, што раблю кніжныя знакі для калекцыянераў, музеяў, бібліятэк. Рабіў экслібрыс для Чэшскай Нацыянальнай бібліятэкі, Амстэрдамскага музея мастацтваў, для розных суседнія вядомых калекцыянераў. Стараюся як мага больш займацца творчасцю: удзельнічаю ў выставах, бяруся за недарагія заказы ў Беларусі, якія мяне асабіста цікавяць — вось як з Маслюковым. Калі б гэты тэкст яшчэ быў па-беларуску, наогул выданню цаны не было б. Зараз у нас шалёная нястача цікавай прыгодніцкай літаратуры на беларускай мове. Вось майму 10-гадоваму сыну не хапае такіх кніг. Янка Маўр? Сыну цяжкавата чытаць. Ён не зусім разумее гэтую стылістыку, час. Не хапае сучасных беларускіх герояў, якія былі б цікавыя 10-15-гадовым дзецям. Таму ў іх потым і ўзнікае пытанне — навошта наогул патрэбна беларуская мова?

— Што чакае беларускую кніжную графіку ў будучыні?

— Гэта вельмі комплекснае пытанне. Але асноўнае, што я бачу са свайго і бацькавага вопыту — мастакі кнігі ў нас зараз раздзяляюцца на ілюстратараў і дызайнераў. А для мяне мастак кнігі — гэта як арт-дырэктар праекта. Ён цалкам вядзе кнігу — з самага пачатку да моманту, калі трэба выбіраць паперу, лак, друкарню. Мастак кнігі павінен рабіць цалкам аўтарскі праект — падабраць шрыфтавую гарнітуру, фармат, зрабіць макет кнігі і г.д. Калі мастак адукаваны на такім узроўні, то будуць атрымлівацца вельмі цікавыя яркія кнігі. Ёсць мастакі, якія хочуць заставацца і працаваць у Беларусі. Толькі зноў-такі — праблема не ў мастаках (яны знойдуцца), а ў саміх выдавецтвах і запатрабаванасці прафесійнай мастацкай працы. У свеце мастацтва кнігі паступова пяройдзе ў трохі архаічны элітны напрамак. Вялікая колькасць мастакоў і ў Еўропе, і ўжо ў Беларусі працуе над стварэннем аўтарскіх праектаў, якія выпускаюцца тыражом не больш за 500 экзэмпляраў, друкуюцца ўручную і г. д. Цудоўным прыкладам з'яўляюцца некаторыя кнігі Юрыя Якавенкі, нашага вядомага афарціста. Тое, што робіць Павел Татарнікаў — таксама аўтарская кніга. У такія арт-аб'екты людзі будуць укладваць грошы, як у альбомы па мастацтве. Усё астатняе сыдзе ў лічбавыя тэхналогіі, дзе выява наогул не патрэбна. Не перастаю шкадаваць, што ў сувязі з гэтай «алічбоўкай» абсалютна знікла чорна-белая ілюстрацыя. Мой сын зараз вельмі шмат чытае: Купера, Вальтэра Скота і іншай падлеткавай прыгодніцкай літаратуры. Старыя выданні, там шмат чорна-белых ілюстрацый. Яны былі вельмі танныя ў вытворчасці, ішлі разам са шрыфтам на адной пласціне. Але яны настолькі ўзбагачаюць кнігу! А зараз разважаюць так: калі рабіць ілюстрацыю, дык толькі каляровую. Але ў чорна-белых была свая містыка, загадка. Чытач можа ў сваім уяўленні расфарбоўваць чорна-белы малюнак.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.
Фота з архіва Рамана Сустава.

Энцыклапедычныя пошукі беларусаў. І не толькі...

2012 ГОД КНІГІ

У Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь прайшоў міжнародны «круглы стол» на тэму: «Энцыклапедыя — пашпарт краіны. Задачы развіцця агульнай інфармацыйнай прасторы».

Арганізатарамі сустрэчы зацікаўленых сураз-моўцаў з розных краін свету выступілі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» і газета «Звязда». Праводзіўся «круглы стол» пры падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Удзел перыядычнага выдання ў такім праекце зусім не выпадковы. Сённяшні час дыктуе неабходнасць радыкальных змен у інфармацыйных патоках нават у тым выпадку, калі яны выкладаюцца ў традыцыйнай энцыклапедычнай

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«вокладцы». Якраз пра гэта гаварылі госці з Расіі, Азербайджана, Арменіі, Таджыкістана, Украіны, Літвы, Венесуэлы. Усе прысутныя былі адзінадушнымі ў высокіх ацэнках беларускага вопыту выдання сучасных энцыклапедый. Шмат гаварылася і пра зробленае менавіта ў апошнія гады, і пра гістарычныя традыцыі, і пра тое, што з'явіўся па-свойму ўнікальны кніжны праект «Энцыклапедыя рарытэтаў». Разумеючы, што стварэнне энцыклапедый — праца на гады, нават на стагоддзі наперад, выдаўцы адзначылі высокую адказнасць за захаванне і тыражаванне інфармацыі на старонках сваіх выданняў. Удзел у «круглым стале» прынялі многія вядомыя беларускія навукоўцы, кіраўнікі гуманітарных інстытутаў Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Будучыня і ў развіцці энцыклапедый, несумненна, звязана з новымі тэхналогіямі. Найперш — з электроннымі дадаткамі, што дазволяць пашырыць прастору папяровай кнігі, зробяць шырэйшымі магчымасці карыстання інфармацыяй, дададуць ёй насычаны візуальны характар. Пра клопаты беларускай дзяржавы ў гэтым кірунку, стварэнне адпаведнай праграмы гаварыла і першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія Ананіч. Цікавым падалося выступленне кіраўніка Цэнтра лацінаамерыканскіх даследаванняў імя Рамула Гальегаса спадара Раберта Эрнандэса Мантоя (Венесуэла). Ён расказаў пра энцыклапедычныя праекты, якія паяднаі намаганні некалькіх краін Баліварыйскага альянса — Кубы, Венесуэлы, Эквадора, Нікарагуа, Балівіі. Менавіта разам яны зрабілі электронную энцыклапедыю, дзе ўпершыню назапашаны веды пра гісторыю і культуру ўсіх народаў, якія маюць дачыненне да гэтага цікавага геаграфічнага складніка Амерыкі. Цесныя стасункі ў Беларусі сфарміраваліся з Выдавецкім цэнтрам навукі і энцыклапедый Літвы. Яго дырэктар Рымантас Карэцкас — часты госць у нашай краіне. А літоўскі цэнтр падтрымлівае выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» ў многіх пачынаннях, звязаных з выкладаннем супольнай гісторыі Беларусі і Літвы.

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

Чытач — газета

«ТЫ ШЧАСЦЕМ СТАЛА БЕЛАРУСАЎ, ІХ ПУЦЯВОДНАЮ «ЗВЯЗДОЙ»

Гэтыя радкі наш паэт Анатоль Астрэйка напісаў у 1967-м годзе, але актуальнасці сваёй яны не страцілі і цяпер.

Я выпісваю і чытаю «Звязду» вельмі даўно, так што словы Сяргея Касцяна, які назваў яе «настольнай газетай кожнай беларускай сям'і», дапоўніла б хіба словамі «не толькі беларускай».

Кожную суботу «Звязда» радуе нас «Хатняй энцыклапедыяй», часта друкуе «Крынічку» для дачнікаў, «Сканворды» для ўсіх. Люблю чытаць змястоўныя апавяданні на конкурс, суб'ектыўныя меркаванні знакамітых людзей пра 5 гарадоў, 5 асоб, 5 помнікаў культуры і г.д., якія павінен ведаць кожны беларус...

А «Лісты пра галоўнае», дзе ўзнімаецца праблема стану роднай мовы? Аляксандр Лукашанец са старонак «Звязды» справядліва зазначаў, што аўтарытэт беларускай мовы значна павысіцца, калі ёй стануць карыстацца вядомыя, аўтарытэтныя, паспяховыя людзі. Адзінае — голас іх павінен быць больш чутным, рашучым.

Добра падаецца ў газеце і краязнаўчы матэрыял. Цуд — пра Полацк (стары, і сённяшні) аж чатыры старонкі ды з фотаздымкамі! Дарэчы, яны заўсёды вельмі ўпрыгожваюць нашу газету, робяць яе больш прывабнай і цікавай.

Апошнім часам шмат матэрыялаў ідзе пра кнігі, пра Янку Купалу і Якуба Коласа, пра Максіма Багдановіча, таму яго словамі і заканчваю свой ліст:

Жывеш не вечна, чалавек,
Перажыві ж у момант век!
Жыві і цэльнасці шукай,
Аб шыраце духоўнай дбай.

Усяму гэтаму і вучыць газета «Звязда».

Эмілія ВАСІЛЕВІЧ,
г. Мінск.

ЦАНІ ЖЫЦЦЁ! БЕРАЖЫ КАХАННЕ!

Дзяржаўтаінспекцыя Гродзеншчыны сумесна з радыё «Гродна» вечарам 14 лютага правядзе ў абласным цэнтры акцыю «Цані жыццё! Беражы каханне!»

Кожны прахожы атрымае магчымасць пакінуць сваё пасланне любімаму чалавеку. А закаханыя, якія прыйдуць да святлодыёднага экрана на Савецкай плошчы і будуць абазначаны флікерамі, могуць атрымаць арыгінальныя падарункі і пракаціцца на лімузіне. Іншыя падрабязнасці акцыі арганізатары трымаюць у сакрэце.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Свой стыль

Чорная котка і белы кот

Сімвалічныя цацкі і прыгожыя рэчы вырабляе маладая магілёўская рамесніца Марыя Куляшова

НЕБЫТА персанажы вядомага мастацкага фільма Эміра Кустурыцы, чорная котка і белы кот (альбо наадварот, калі хочаце) — прыгожая пара. Але зроблены каты з воўны, што дазваляе ім, для большай трываласці рамантычных адносін, счапіцца хвастамі і трымаць чырвонае сэрца.

— Дзень усіх закаханых у мяне асацыюецца з катамі, іх мяккасцю і пяшчотай, — тлумачыць майстрыха. — Гэтая цацка павінна ў дзень свята, 14 лютага, сказаць некаму нешта вельмі добрае. Я дасылаю з ёй энергетыку кахання.

Вось такія «звалены» пачуцці. З воўны зроблены не толькі каты, але і актуальныя ў 2012 годзе дыназаўрыкі і мішкі. Аўтар прадае гэтыя арыгінальныя сувеніры па 40-50 тысяч рублёў.

Марыя Куляшова паводле адукацыі настаўніца гісторыі. Інтарэс да рукадзелля ў прыгажуні з Магілёва з'явіўся некалькі гадоў таму і меў непасрэднае дачыненне (не паверыце!) да сабакі. Бабтэйл па мянушцы Афелія — любімы гадаванец Машы, і яна актыўна кантактавала з аматарамі такіх сабак у сацыяльных сетках.

— А потым убачыла на старонцы сяброўкі фота пацерак з воўны, як аказалася — сабачай, — расказвае дзяўчына. — Я таксама вырашыла, што не трэба дарма дабру прападаць, і такім чынам пазнаёмілася з **фелтынгам, мастацкім валеннем воўны**. Тэхніцы вучылася ў інтэрнэце. З воўнай працаваць прыемна і цікава. А шэрыя пацеркі і сумку-клатч «ад Афелії» я нашу і цяпер.

Ёсць звесткі, што людзі зразумелі, як прымяняць здольнасць воўны лямчыцца, яшчэ некалькі тысяч гадоў таму. З тых часоў, зразумела, з'явіліся спецыяльныя машыны для гэтай справы. Але Маша, як і іншыя рамеснікі, валіць воўну рукамі, з дапамогай губкі і іголак.

У Магілёўскім гарадскім цэнтры культуры і вольнага часу рамесніца Куляшова паказвае **майстар-клас.** Здаецца, што тыкаць іголкамі ў пасму ярка-чырвонай воўны няцяжка, але ў рэальным часе спатрэбіцца некалькі гадзін, каб атрымаліся прыгожыя завушніцы — чырвоныя шарыкі з барвовымі палосачкамі альбо бубачкамі.

Разам з пацеркамі ў тон атрымліваецца цудоўны зімовы камплект: калі прымяраеш, то воўна здаецца нават цёплай, што прыемна ў цяперашнія марозныя дні. Кошт камплекта — 70 тысяч. Асобна пацеркі з воўны каштуюць ад 50 да 150 тысяч, у залежнасці ад даўжыні.

— Попыт на такія вырабы ёсць, — каментуе Маша. — Мне падаецца, што ўвогуле набірае абароты «hand maid», ручная праца. Яе папулярнасць тлумачыцца тым, што ў індустрыяльным грамадстве, дзе пануе фабрычная вытворчасць з серыйнасцю і штампоўкай, кожная рэч, зробленая рукамі, нясе ў сабе нейкую духоўнасць, ідэю майстра, асаблівасць.

Асартымент вырабаў у майстрыхі вялікі: аказваецца, нават індыйскія бранзалеты могуць быць аздобленыя воўнай. Вокладка фотаальбома шыкоўна глядзіцца з ваўнянымі кветкамі. Вялікі попыт у жанчын на гаржэткі і брошкі, асабліва пасля таго як амерыканская актрыса Сара Джэсіка Паркер у вядомым жаночым серыяле ўвесь час хадзіла з кветкавымі брошкамі. Абадкі для валасоў з кветкамі — яшчэ больш актуальная модная ідэя.

Але найбольш цікавымі падаліся званеныя шалікі самых розных колераў і формаў. Сярэдні кошт шалікаў — 120 тысяч рублёў. Ёсць нават зробленыя ў новай тэхніцы нана-фелтынгу, калі з воўнай аб'ядноўваюцца ў адно цэлае зусім іншыя тканіны — напрыклад, шыфон ці карункі.

— У кожную працу ўкладаюцца добрыя эмоцыі майстра, і гэта яшчэ адна перавага нашых работ, — гаворыць Маша. — Я магу глядзець кіно ці слухаць музыку пакуль працую. Добра працуецца пад «Бітлз» і «Ролінг Стоўнз».

Цікава, што адзін з шалікаў яна зрабіла, калі слухала аўдыёкнігу Говарда Лаўкрафта. Машы падабаюцца містычныя фантазіі гэтага пісьменніка. Здаецца, што жахлівае боства Ктулху, прыдуманае Лаўкрафтам, пакінула адбітак на шаліку. «Не, у творах Лаўкрафта ўсё туманнае і шэрае, а шалік атрымаўся, наадварот, сонечным. Гэта рэч для яркага чалавека», — усміхаецца майстрыха.

Маша не шкадуе, што памяняла стабільную настаўніцкую працу на творчае непастаянства рамесніцтва. Яна кажа, што зарабіць можна, калі не ленавацца і знаходзіць новыя ідэі. Ды і хочацца, каб праца прыносіла не толькі грашовыя знакі, але і асабістае задавальненне. На шчасце, такіх рамеснікаў, як Марыя Куляшова, крызіс не зваліў з ног: проста прадукцыя стала даражэйшая з-за імпартных матэрыялаў, але заказы людзі робяць.

Стаць рамеснікам сёння нескладана. Дастаткова, як гэта зрабіла больш за год таму Марыя Куляшова, заявіць пра сябе ў падатковай інспекцыі і раз на год заплаціць нязначную суму ў бюджэт. З гэтага часу можна прадаваць свае вырабы на кірмашах і выставах, у інтэрнэце. Напярэдадні дня святога Валянціна магілёўскія майстры збіраюцца выйсці на пешаходную вуліцу Ленінскую ў абласным цэнтры, каб гандляваць сувенірамі. Гэта калі маразы не перашкодзяць. Таму ў **аматарскага аб'яднання рамеснікаў «Магілёўскія майстры»** ёсць надзея, што ў будучыні ў іх з'явіцца асобная крама ці выставачная зала, дзе можна будзе, без аглядкі на надвор'е і святы, прадстаўляць публіцы свае работы.

— Гэта патрэбна і нам, і людзям, — гаворыць **старшыня аб'яднання Святлана ЦІМАШЭНКА.** — З кожнай выставай рамеснікаў павялічваецца попыт. Людзям падабаецца. Усё навокал масавае, кітайскае, пластмасавае, а майстар дае вам нешта індывідуальнае, эксклюзіўнае. Гэта вам не шырспажыў, а рэдкая рэч, і тыя, хто цэніць гэта, цікавяцца беларускім рамеснікам.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
16 марта 2012 г. проводит открытый аукцион № 01-Сф-12 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение цены продажи).
Предмет аукциона: право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляются 10 земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных (блокированных) жилых домов в г. Минске:

№ п/п	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.
1	2	3	4	5	6	7
1.	ул. Фучика, 1 (Заводской район)	500000000002007566	0,0498	367 245 120	36 000 000	2 134 249
2.	ул. Фучика, 7 (Заводской район)	500000000002007565	0,0574	423 290 560	42 000 000	2 134 249
3.	пер. 1-й Подшипниковый, 21 (Заводской район)	500000000002007721	0,0532	410 150 720	41 000 000	2 168 213
4.	пер. 1-й Детский, 15 (Заводской район)	500000000002007735	0,0476	366 976 960	36 000 000	2 168 213
5.	ул. 1-я Поселковая, 97 (Советский район)	500000000008005468	0,0822	771 496 320	77 000 000	2 168 213
6.	земельный участок № 1 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005469	0,0754	461 251 960	46 000 000	2 168 213
7.	земельный участок № 22 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005076	0,0736	450 240 640	45 000 000	1 864 388
8.	земельный участок № 23 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005482	0,0733	448 405 420	44 000 000	2 168 213
9.	земельный участок № 27 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005372	0,0700	428 218 000	42 000 000	1 864 388
10.	земельный участок № 32 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005371	0,0638	390 290 120	39 000 000	1 864 388

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Земельные участки, расположенные в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 находятся в водоохранной зоне водных объектов г. Минска, имеют пониженный рельеф местности, высокий уровень залегания грунтовых вод, представлены торфяными почвами. Инженерно-геологические условия территории ограниченно благоприятные для строительства на естественном основании. Осложняющими факторами являются условия поверхностного стока, во влажные периоды года возможно застаивание атмосферных и талых вод в понижениях микрорельефа.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

осуществление государственной регистрации прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (начало строительства) осуществить не позднее одного года после получения свидетельства о государственной регистрации прав на них.

Аукцион состоится 16 марта 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток (задатки) (не позднее 12 марта 2012 г.) в размере, указанном в графе 6 (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 14 февраля 2012 г. по 12 марта 2012 г. по рабочим дням в рабочее время.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минским горисполкомом предоставляется рассрочка внесения платы за земельный участок.

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72, официальный сайт организатора торгов **www.mgcn.by.**

Мы і суседзі

ПАМІЖ ЦТ І АДЗІНЫМ ДЗЯРЖАЎНЫМ ЭКЗАМЕНАМ ПРАКЛАДУЦЬ МОСТ?

У дадзены момант у Беларусі навучаюцца ўсяго 2 тысячы расійскіх грамадзян, а ў Расійскай Федэрацыі вышэйшую адукацыю атрымліваць каля 20 тысяч беларусаў. Гэтыя лічбы агучыў падчас відэабрыфінгу на партале Саюзнай дзяржавы www.soyus.by старшыня Пастаяннай камісіі палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе, член Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

На думку парламентарыя, такая статыстыка (не на карысць беларускіх ВНУ) часткова абумоўлена не вельмі зручнымі для расіян тэрмінамі правядзення ў Беларусі цэнтралізаванага тэсціравання. Выпускнікі расійскіх школ бягучага года не паспяваюць паўдзельнічаць у ЦТ, паколькі ў чэрвені яны здаюць выпускныя экзамены ў школах.

— Карэкціроўка тэрмінаў правядзення ўступных іспытаў дазволіла б павялічыць прыток у Беларусь расійскіх абітурыентаў, што, у сваю чаргу, павысіла б канкурэнцыю сярод маладых людзей, якія жадаюць атрымліваць якасную вышэйшую адукацыю, — падкрэсліў Уладзімір Зданович. — І калі мы імкнёмся да стварэння адзінай адукацыйнай прасторы, то без выраўноўвання падыходаў да адбору абітурыентаў проста не зможам абысціся. Гэта тычыцца і прадастаўлення пры паступленні льгот пэўным катэгорыям абітурыентаў, і правоў на залічэнне без уступных іспытаў пераможцаў алімпіяд, конкурсаў і інтэлектуальных турніраў. Вядома, адзіны дзяржаўны экзамен і цэнтралізаванае тэсціраванне маюць шэраг адрозненняў і ў плане іх арганізацыі і правядзення, і ў плане пабудовы тэстаў, і ў плане ацэньвання і падліку балаў. Але цэнтралізаванае тэсціраванне як форма конкурснага адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет дзейнічае ў Беларусі ўжо каля дзесяці гадоў. У Беларусі створаны Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў, які займаецца падрыхтоўкай і правядзеннем цэнтралізаванага тэсціравання. Таму кардынальна штосьці змяніць у правілах прыёму ў ВНУ ў бліжэйшы час будзе, напэўна, немагчыма. Разысціся — заўсёды вельмі проста, а вось зблізіцца — вельмі праблематычна. Але мы будзем спрабаваць гэта рабіць...

Старшыня парламенцкай камісіі не выключае таксама, што з цягам часу на тэрыторыі Беларусі, Расіі і Казахстана будзе выпрацаваны адзіны механізм правядзення ўступных выпрабаванняў. «Думаю, што мы да гэтага прыйдзем па меры развіцця адзінай эканамічнай прасторы», — дабавіў ён.

ДЛЯ ДАВЕДКІ: асаблівасцю правядзення адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет у Казахстане з'яўляецца здача інтэграванага тэста адразу па чатырох-пяці дысцыплінах. Фарміраванне студэнцкага кантынгенту адбываецца ў гэтай краіне па тэхналогіі адзінага нацыянальнага тэсціравання і комплекснага тэсціравання абітурыентаў. Адзінае нацыянальнае тэсціраванне (АНТ) уяўляе сабой форму выніковай атэстацыі навучэнцаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, сумешчаную з уступнымі экзаменамі ва ўстановы больш высокай ступені навучання. Яно праводзіцца для выпускнікоў, якія хочуць у гэтым годзе паступаць ва ўстановы адукацыі больш высокай ступені навучання, і спалучае пяць вучэбных дысцыплін: казахскую або рускую мову (у залежнасці ад таго, на якой мове вялося навучанне), матэматыку, гісторыю Казахстана, казахскую мову для выпускнікоў школ з рускай мовай навучання і рускую мову для школ з казахскай мовай і адзін з прадметаў у залежнасці ад абранай спецыяльнасці. А комплекснае тэсціраванне прызначана для выпускнікоў папярэдніх гадоў, выпускнікоў пачатковых і сярэдніх прафесіянальных устаноў, а таксама для грамадзян, якія навучаліся за мяжой. Комплекснае тэсціраванне праводзіцца па чатырох прадметах: казахскай ці рускай мове, гісторыі Казахстана, матэматыцы і профільнай дысцыпліне. Да таго ж у Казахстане сфера прымянення комплекснага тэсціравання больш шырокая, чым у нас. Знешні дзяржаўны кантроль ажыццяўляецца там пры прыёме ў магістратуру, рэзідэнтуру, ад'юнктуру і дактарантуру.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Да ведама

АДМЕНЕНЫХ РЭЙСАЎ ПАБОЛЕЛА!

Колькасць адмененых рэйсаў па міжгародніх маршрутах папоўнілася новымі пазіцыямі. Прычына ўся тая ж — умовы надвор'я.

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», 11 і 12 лютага не будзе выконвацца рэйс па маршруце Мінск—Гродна праз Ліду адпраўленнем са сталіцы ад АВ «Усходні» ў 6.50, ад АВ «Цэнтральны» — у 7.20 (з Гродна — у 15.25); 10 і 12 лютага — рэйс па маршруце Мінск—Гродна праз Ліду адпраўленнем з Мінска ад АВ «Усходні» ў 12.00, ад АВ «Цэнтральны» — у 12.30 (з Гродна — у 19.00). 11 лютага не варта спадзявацца выехаць рэйсам па маршруце Мінск—Навагрудак, які павінен быў выправіцца са сталіцы ад АВ «Усходні» ў 7.40, ад АВ «Цэнтральны» — у 8.10 (з Навагрудка — у 13.40). 11 і 12 лютага не будзе і рэйса па маршруце Мінск—Капыль адпраўленнем з Мінска ад АВ «Усходні» ў 14.40 (з Капыля — у 19.00). 11 лютага адмяняецца рэйс па маршруце Мінск—Шаркаўшчына, які павінен быў выправіцца ў дарогу з Мінска ад АВ «Усходні» ў 6.30, ад АВ «Маскоўскі» — у 9.00 (з Шаркаўшчыны — у 12.10). 12 лютага па ўмовах надвор'я не будзе рэйса па маршруце Мінск—Паставы: пасажыры не змогуць выехаць са сталіцы ад АВ «Усходні» ў 8.30, ад АВ «Маскоўскі» — у 9.00 (з Пастаў — у 16.50). 10 і 12 лютага пасажыры не змогуць скарыстацца паслугамі рэйса па маршруце Мінск—Магілёў адпраўленнем з Мінска ад АВ «Усходні» ў 9.40 (з Магілёва 10 лютага ў 17.35, 11 лютага — у 15.25). Не будзе 10 лютага і рэйса па маршруце Мінск—Магілёў адпраўленнем ад АВ «Усходні» ў 17.00 (з Магілёва — у 20.20).

Сяргей РАСОЛЬКА.

Сацыяльны рэпартаж

У ГОСЦІ ДА... БЯЗДОМНЫХ

ЖЫЛЛЁ ЦІ, НАЙПЕРШ, ЛЮДСКАЯ ЦЕПЛЫНЯ АДАГРЭЕ ІХ НЕПРЫКАЯНЫЯ ДУШЫ?

Хутаюся ў шалік, намагаюся хоць неяк ратавацца ад нішняга марозу. З задавальненнем успамінаю, што яшчэ сорак хвілін таму хадзіла па кватэры ў мяккіх тапках і трымала кубак цёплай гарбаты ў руках. Не пазайздросціла б таму, хто вымушаны ў такое надвор'е жыць на вуліцы. Пераходжу мост цераз Свіслач, мінаю высокі каменны плот, спыняюся ля былога будынка 2-й гарадской бальніцы ў Мінску. Месца з доўгай афіцыйнай назвай «Пункт часовага знаходжання асоб без пэўнага месца жыхарства» тут адчынілі некалькі дзён таму.

...Абстаноўка — як у бальніцы: у пакоі чатыры жалезныя ложкі, засцеленыя байкавымі коўдрамі, і стэрыльная чысціня. Падушкі пастаўлены вертыкальна, на тумбачках у вазонах стаяць раслінкі, змучаныя шэрым святлом з вялікіх вокнаў.

— Вось тут у нас палаты, іх больш чым дзесяць.Там прыбіральня, душавая, — праводзіць нас з фатографам па калідоры Мікалай Віркевіч, дырэктар дзяржустановы «Дом начнога знаходжання асоб без пэўнага месца жыхарства».

Тыя, каго звычайна называюць бамжамі, цяпер могуць прыйсці перажываць маразы ў будынак 2-й бальніцы. У пункце часовага знаходжання 55 месцаў, але пакуль што «пастаяльцаў» набралася каля дзясятка.

— Бяздомных, якія да нас прыходзяць, спачатку адпраўляем у санпрапускнік на дэзынфекцыю, а пасля ўжо можна і засяляць, — расказвае Мікалай Віркевіч.

Жыць у пункце часовага знаходжання бяздомныя маюць права да красавіка. Застаецца неабавязкова, можна проста зайсці пагрэцца, папіць гарбаты, падсілкавацца макаронай хуткага прыгатавання. Валанцёры з Чырвонага Крыжа гэта забяспечаць.

У асноўным бамжы прыходзяць па дапамогу самі: камусьці падказаў дворнік ці міліцыянер, хтосьці даведаўся ад такога ж бедака, які вымушаны ў мароз начаваць на вуліцы.

Пакуль супрацоўнікі пункта часовага знаходжання расказваюць пра жыццё-быццё ў ім, у дзверы нясмела заходзіць мужчына, узрост якога цяжка вызначыць. Каўнер старога штучнага футра не хавае голай шыі, боты на нагах не зашпільваюцца, у руках набітая чымсьці сумка.

— Дайце вады папіць! — мужчыну з сумкай цяжка даліся тры-чатыры пралёты лесвіцы. Ён абапіраецца на сцяну. На аб'ектыў фотаапарата рэагуе незразумелымі гартаннымі гукамі. Відаць, што незадаволены.

Мужчына асушвае шклянку і змаўкае.

Ідзём знаёміцца з жыхарамі. Адчыняем дзверы палаты, дзе жывуць чатыры мужчыны.

— Яны ў нас, пакуль прыйшла прыбіральшчыца, ужо самі парадак навялі, — гаворыць нехта з супрацоўнікаў.

«Пастаяльцы» сядзяць на ложках і пра нешта гавораць. На падваконні ляжыць чай у пакеціках і нарэзаны хлеб.

Перад незнаёмымі мужчыны адразу прыпынілі гаворку і пачалі насцярожана пазіраць. На першы погляд, усім гадоў па 40—50, татуіроўкі на пальцах некаторых выдаюць мінулае, праведзенае за кратамі.

Спрабую неяк разбіць сцяну недавер:

— Як вас завуць? — пытаюся ў аднаго з бяздомных.

— Коля, — вочы ў мужчыны ва ўзросце каля пяцідзесяці нейкія дзіцячыя, нібыта здзіўленыя. І чамусьці вінаватыя.

Коля нарадзіўся ў Комі АССР. Яго маці была родам з Бабруйска, паехала ў Комі жыць да мужа, які адбываў тэрмін. Пасля усе разам вярнуліся ў Беларусь. На вуліцы прымусіла аказацца стандартная гісторыя. Чытач можа здагадацца сам: час ішоў, маці памерла, сястра прадала кватэру.



Аб'ява, якую бомж Аляксандр аднёс у царкву.

Пытаюся, як выжываюць бяздомныя ў халады?

— Вой, цяпер усе пад'езды зачыненыя, з дамафонамі, не пагрэешся. Колькі народу памірае зімой, — скардзіцца Коля.

Бяздомны, які назваўся Аляксандрам, па ўласных словах «больш за дваццаць гадоў валачыўся па месцах пазбаўлення волі, а цяпер паверыў у Бога». Абставіны, што, па яго расповедах, прывялі Аляксандра да жыцця на вуліцы, нагадваюць эпізоды з мексіканскага серыяла:

— Я вырас у не надта заможнай сям'і, у 16 гадоў пайшоў працаваць на завод. Я не меў права, малы ж яшчэ, але ўсё роўна пайшоў. Мяне там хвалілі, добрым быў работнікам. Вось так жыў і аднойчы пазнаёміўся з дачкой начальніка крымінальнага вышуку. Ёй 15, мне 17. Каханне атрымалася. Яна зацяжарала.

— І што, вы ажаніліся?

4.1 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.2 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.3 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.4 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

4.5 представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

4.6 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 7 марта 2012 г.** включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а (каб. № 4). Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.40 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27; факс: 77 48 85. Наш сайт – www. gorod.gomel.by

Утерянные представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2НПЗ серии БЛ № 0431463, 0431472 **считать недействительными**.

УНП 101883943

Считать недействительными страховые полисы ФСООО «Белкоопстрах»: по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ 3911571, 274285; по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВС 1897497, 5438910, 1936586, 1936598, 3349408; квитанции 1СУ серии КС 229987, 593109.

УНП 102332274

К публикации ГОМЕЛЬСКОГО ГОРОДСКОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА извещения о проведении аукциона по продаже права аренды земельных участков, который состоится 22 февраля 2012 г. (газета «Звязда» от 21.01.2012 г.) ДОБАВЛЯЕТСЯ ЛОТ № 29 в следующей редакции:

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Целевое назначение – строительство	Качество земли	Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ	Срок аренды (лет)	Начальная стоимость, бел. рублей	Затраты на подготовку документации, бел. рублей	Сумма задатка, бел. рублей
29	в районе индивидуальной жилой застройки «Романовичи», участок № 795 (по генплану)	340100000008002893	0,0900	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	к землям сельскохозяйственного назначения не относятся	ограничений в использовании нет	99	12 460 140	1 397 571	2 490 000
Лот № 29 выставляется повторно. Извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.11.2011 г.										

Асоба

НЕСАКРЭТНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ПРАФЕСАРА ШТЭЙНЕРА, альбо Змаганне з «культурнымі комплексамі» праз чытанне

У культуры не бывае дробязяў. У ёй важны кожны эпізод, элемент, прадмет — нібыта сакральны сімвал, код, за якім хаваецца інфармацыя пра народ. Інфармацыя несакрэтная, ды толькі разумець сімвалы мы адвучыліся і ўсё больш глядзім на іх як на ўтылітарнае сведчанне былога жыцця. Чытаць сакральныя сімвалы — навука, якая захоўваецца пакаленнямі. Ці не захоўваецца з розных прычын... Тады можна чытаць кнігі, дзе і пра пакаленні, і пра сімвалы, і пра тое, на чым трымаецца еднасць людзей, якія называюцца народам. Чытанне кнігі заўсёды было ў нас прыкметай «прасунутасці».

Беларусы — «прасунуты» народ, зразумела я пасля размовы з Іванам ШТЭЙНЕРАМ, прафесарам Гомельскага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны. За апошні час Іван Фёдаравіч быў удзельнікам шматлікіх з'ездаў славістаў у Польшчы, Славеніі, Македоніі, дзе паслухаў, як на ўсіх мовах даклады гучаць ды кожны пра сваю літаратуру распавядае. І стала яму крыўдна за нашу культуру, якая знаходзіцца на ўзроўні іншых славянскіх, але ад уласнай сціпласці сама ж і пакутуе, не разумеючы сваёй значнасці. Чалавеку ў такіх выпадках бываюць карысныя размовы з псіхааналітыкам — каб пазбавіцца ад комплексаў. Я гатовая пазбавіцца ад «культурных комплексаў», тым больш што прафесар Штэйнер дапамагае зрабіць гэта праз аналіз літаратуры, адзначаючы ў ёй уласцівыя беларускай культуры рысы:

1. КНІЖНАСЦЬ

— На працягу апошняга тысячагоддзя беларуская культура развівалася як кніжная, — гаворыць Іван Фёдаравіч. — Прычым у спалучэнні з еўрапейскімі традыцыямі. Таму і Еўфрасінню Полацкую падчас падарожжа ў Святую Зямлю ўспрымалі як роўную... Пасля Скарыны ў нас сталі шаванаць друкаваную кнігу. І не толькі ў нас — адсюль кнігадрукаванне пайшло далей на ўсход. Пасля былі Цяпінскі, Фёдараў ды Сімяон Полацкі, які паказаў, што са слоў можна ствараць. Мы як мозг — у пэўнай ступені, у пэўны час цягнулі за сабой: беларускія землі былі пераходным мастком, які звязваў цывілізацыі. Таму беларуская культура і стала донарам для іншых.

Мяне вельмі хвалюе, што мы не надта добра яе ведаем, для таго, каб ацаніць належным чынам. Маю на ўвазе і кожнага паасобку, і ўвесь народ. Я ўспамінаю сябе маладога: хацеў замежнай літаратурай займацца, шмат чытаў, захапляўся. Пайшоў на філфак, хацеў стаць пісьменнікам, нават пісаў фантастычны раман у школе пра гібель цывілізацыі. Але калі заглыбіўся ў чытанне беларускай літаратуры, то не змог адарвацца: у ёй жа ўсё ёсць! Проста трэба ўбачыць і паказаць іншым. Мне, напрыклад, у 70-я гады дазволілі пісаць працу пра экзістэнцыялізм у творчасці Васіля Быкава. Тэрмін сам яшчэ быў для савецкай навукі незвычайны, а ў беларускай літаратуры з'ява ўжо была. Толькі трэба ўбачыць. І ў мяне потым студэнты даследавалі тэмы: гендарныя праблемы (калі гэта яшчэ нямодна было) у беларускай літаратуры альбо інтымная лірыка, эротыка ў сучаснай беларускай паэзіі. Мяне крытыкавалі: што за тэмы ў вас?! Але ж гэта літаратура, якая адлюстроўвала жыццё, а літаратары — жывыя людзі, пра што за савецкім часам часта забывалі ся. А калі заглыбіцца ў нашу літаратуру, то зразумееш: у ёй ёсць тое, што мы шукаем у іншых.

2. ІНАВАЦЫЙНАСЦЬ

— Сапраўды рухавік грамадства — веды... І тыя, хто іх нясе.

— Так і ёсць, таму трэба выхаваць сапраўдную беларускую інтэлігенцыю, у якой ёсць адчуванне самапавагі. Што яна можа? Вось хоць бы такі прыклад: да рэвалюцыі ў Кіеве гаварылі на ўкраінскай мове толькі дзве сямейныя пары. І вось бачым, што цяпер атрымалася. І ў чэхаў было падобнае. Насамрэч, хутчэй пачуюць таго, хто імкнецца гаварыць са светам на сваёй мове, распавядаючы пра сябе — ён больш здольны прыцягваць увагу адметнасцю сярод падобных.

Дзеля таго, каб лепш разумець сябе, мы праводзім раз на два гады канферэнцыю «Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах». Яна прысвечана памяці Івана Навуменкі. Сёлета запросім навукоўцаў з іншых краін. Да нас прыязджаюць са Славеніі, з Чарнагорыі, Польшчы, Германіі, Расіі. Спрабуем праглядзець: што агульнага ў славян, што іх аб'ядноўвае і ў чым — выключнае непадабенства.

Мне наогул цікава разглядаць творчасць нашых пісьменнікаў у славянскім і еўрапейскім кантэксце. Напрыклад, пра Караткевіча я напісаў, паставіўшы яго ў адзін шэраг з класічнымі еўрапейскімі пісьменнікамі. Караткевіч — асоба ўнікальная. Ён не ідзе традыцыйным шляхам для беларускага пісьменніка: творы пра басаногае дзяцінства, філфак, праца ў рэдакцыі, у часопісе — і ўсё, пісьменнік. А ён адразу ўвайшоў у літаратуру, як у святліцу, захацеў сказаць: я думаю так. Ні на каго не азіраўся. Ішоў сваім шляхам. Гэта такі ў нас быў Анатоль Сыс. Я, загадчык кафедры, гадзін у дванаццаць ночы адчыняю дзверы: стаяць Сыс з сябрам. Кажа: «У мяне абарона дыплома заўтра раніцай, а вы мой рэцэнзент». А потым: «Вой, у вас каляровы тэлевізар! Можна, пакуль вы чытаеце, мы паглядзім чэмпіянат свету па футболе?..» Такая прыродная непасрэднасць. Ён і ў паэзіі яе захаваў. На паэтаў нам пашчасціла. Велічны многіх яшчэ давядзецца ўсвядоміць і зразумець, наколькі яны, стваральныя пра Беларусь, маглі ўзнімацца да сусветнага ўзроўню.

Напрыклад, у творчасці Рыгора Барадуліна цікава разглядзець яго «Псалмы» і Біблію. Па сутнасці, гэта літаратурнае пераасэнсаванне нашай рэчаіснасці праз сувязь з адвечнай кнігай, дзе паэт па-свойму глядзіць на цэлы космас, не проста бярэ нейкі выраз з Бібліі і перастварае вобраз, а паказвае, як беларусы спасцігаюць Біблію. Ён глядзіць на космас, на сусвет, на Хрыста вачыма беларусаў.

У гэтым плане асабліва цікавая творчасць Алеся Разанава. На мой погляд Разанаў — выключнейшая з'ява ў гісторыі славянскіх культур. Ён не падобен на звычайнага пісьменніка, ён нібыта з іншага свету. Ягоны свет, яго ўяўленне пра паэзію можна параўнаць з «Салярысам» Станіслава Лема. Гэты фантастычны раман у свой час быў папулярны, а фільм Таркоўскага стаў кінакласікай. Салярыс — нейкая маса, якая жыве асабліваым жыццём, у якую нельга ўвайсці, да яе можна толькі дакранацца. Сусвет Разанава прыўзняты над нашым рэальным, яго нельга вымераць рэальнымі меркамі, і калі крытык спрабуе прэпарыраваць верш, то ён нагадвае мясніка, які трымае сякеру ў руках. Алесь Разанаў даказвае, што геніяльнасць можа быць рассыпаная па ўсім свеце, і яна можа з поспехам сыпацца і над звычайнай вясковай беларускай хатай, і над сталічнымі дахамі. Ён зрабіў тое, што ў свой час зрабілі Бадлер, Малармэ, Апалінер для развіцця еўрапейскай лірыкі, еўрапейскай паэзіі. Яны разумелі, што ў пэўны час літаратура, паэзія ўпіраецца ў сценку, далей развівацца немагчыма. Таму яе якасць павінна змяніцца. Разанаў таксама адчуў, што сучасная паэзія можа быць іншай — і паказаў гэта ў Беларусі. Але сваімі пошукамі ён цікавы для Еўропы. Ён знайшоў новыя формы: вершаказы, пункцыры, квантэмы... Можна па-новаму ўспрымаць жыццё, таму і літаратура набывае новы выгляд. Заўсёды ў літаратуры ішлі пошукі, яшчэ з часоў антычнасці можна іх прасачыць. Ды наш Сімяон Полацкі — таксама смелы эксперыментатар — пісаў вершыкі, але і творы ў выглядзе ліста ці крыжа.

3. ЕЎРАПЕЙСКАСЦЬ

— А яшчэ кажуць, што беларусы кансерватыўныя... Магчыма, быў твор, які перавярнуў ваша ўяўленне пра беларускую літаратуру?

— Паступова назапашваліся веды, уражанні, думкі. Са здзіўленнем зразумеў: у нас ёсць дзіўныя рэчы. «Запіскі Самсона Самасуя» Андрэя Мрыя, напрыклад, я разглядаю не ў класічным стылі, а параўноўваю з «Пахвалой дурасці» Эразма Ратэрдамскага. Я захапляюся ім як філосафам ці багасловам, а тут ён пісаў занатоўкі нібыта выпадкова, едучы ў вёску. Характар многіх з'яў нам зразумелы, многія рэчы не патрабуюць тлумачэння, таму што паказваюць тое, што ўласціва чалавечай натуры. І сама сабою прасіцца паралель: нават у дурасці беларусы бываюць падобныя на еўрапейцаў.

Чытаючы Ратэрдамскага, Парацэльса, Лютэра знаходзіш нешта такое, што нібыта пра нас напісана... Гэта сучаснікі Скарыны. І ён як мысляр для свайго народа зрабіў дабро на цэлыя эпохі. Ён стаіць на тым жа ўзроўні. Ці мы гэта ўсведамляем?

— Скарына — акадэмічная асоба, пра якую аднойчы звесткі напісалі — і ўсё. Але вы вырашылі напісаць пра яго п'есу. Што новага хацелі сказаць у ёй?

— У нас, калі хацелі расказаць пра Францыска Скарыну, то яго паказвалі чалавекам апантаным, узнёслым. Я паказваю іншую сітуацыю: дзеянне пераносіцца ў той час, калі ён вырашае, чым займацца ў жыцці. «Камерцыяй займайся», — гаворыць бацька. — «Бо толькі купцы ў нас маюць уладу. Інакш будзеш бадзяцца па свеце, і ніякай карысці ад цябе не будзе. Шлях я наладзіў...» Тут прыходзіць Парацэльс, вядомы хімік і доктар, прапаноўвае Скарыну: «Давай зробім фірму па вытворчасці лекаў, ты ж быў студэнтам, Еўропу ведаеш... «Потым ён сустракаецца з Лютэрам, з Эразмам Ратэрдамскім, кожны яго спакушае ў свой бок. А Францыск сам можа гараскопы складаць і ведае, якая доля няпростая яго чакае. І ўсё ж выбірае свой шлях... Дык хто ён: блазан ці святы? Для мяне гэта магчымасць на яго прыкладзе паказаць, як жыць дзеля людзей, прыносіць карысць радзіме рэальнай працай, не думаючы пра сябе.

— У нас і зараз багата літаратараў, якія вымушаны рабіць падобны выбар. Але сёння ён яшчэ больш жорсткі, таму што ёсць праблема кніганечытання. Можа, літаратуру нецікава выкладаюць у школах, што ў людзей не выпрацоўваецца жаданне чытаць?

— Некалі Гётэ казаў, што не трэба пісаць твор, калі ты не разлічваеш на тое, што яго прачытае мільён чалавек. А цяпер выдатны празаік (я лічу, адзін з лепшых у Еўропе) Віктар Казько кажа: «Я буду шчаслівы, калі мой твор прачытае хоць адзін чалавек...» Так, жаданне чытаць выхоўваецца ў маладыя гады ў школах і ВНУ. У нас, на жаль, пры выкладанні літаратуры рабіўся націск на тое, што беларускія пісьменнікі толькі апявалі паганае жыццё дакастрычніцкага перыяду, услаўлялі савецкі час, што яны пасвілі кароў на лугах і гэтак далей. Хоць вялікая частка нашай літаратуры пачатку XX стагоддзя створана шляхтай. Вялікі пісьменнік, які не належаў да шляхты, — Якуб Колас. Дагэтуль у нас склалася ўражанне, што Купала і Колас — блізнятыбраты. А яны абсалютна не падобныя па ўсім: па нараджэнні, па веравызнанні, па ўспрыманні свету, па схільнасцях да прозы і паэзіі. Праграмы па літаратуры складваліся нібыта спецыяльна, каб адбіць жаданне ў беларусаў чытаць на беларускай мове. Бо ў першую чаргу ў іх траплялі творы сацыяльнага зместу. Лірыка часцей за ўсё праходзіла міма. І пра саміх пісьменнікаў як распавядалі: цяжкае жыццё, пару фрагментаў, вырваных з біяграфіі. Урокі па літаратуры, на мой погляд, трэба ператвараць у вечар гучання слова, каб яго ацанілі і палюбілі. Напрыклад, не расказваць пра мілагучнасць радка паэзіі Куляшова, а даць паслухаць і сказаць: гэта ён у 16 гадоў напісаў.

4. ФІЛАСАФІЧНАСЦЬ

— Якая з тэм у беларускай літаратуры вас асабліва чапляе?

— Светаўспрыманне, філасофія быцця ў гэтым свеце. Той жа самы наш фальклор — гэта асаблівы свет. Вядомы фалькларыст Сержпутоўскі распавядаў, як на гомельскім Палессі запісваў свае сустрэчы з таленавітымі народнымі апавядальнікамі. У іх не было ніякай адукацыі, але яны расказвалі творы так, як павінны пісаць сапраўдныя пісьменнікі, якія прайшлі цэлую школу навучання. Варта хоць бы звярнуцца да казак, у якіх нашы даследчыкі вылучалі сацыяльныя матывы, кпіны з паноў, папоў ды ксяндзоў. Але калі глыбей капнуць — беларуская казка не такая была! Яшчэ ў Міхала Федароўскага, які напісаў «Люд беларускі на Русі Літоўскай», можна прасачыць, якія ў нас былі казкі. Часта з даволі жорсткім канцом. А ён запісаў сапраўдныя беларускія казкі. Напрыклад, мядзведзь скраў жанчыну, яна нарадзіла яму дзяцей і адпомчы ўцякла. А мядзведзь крычаў, схапіў дзяцей, разадраў і сышоў у лес... Вось глыбіня — сутыкненне чалавечага і жывёльнага пачаткаў, фактычна ўжо філасофія. Я чытаю беларускія казкі, запісаныя ў XIX стагоддзі, і разумею, што яны практычна аднолькавыя з італьянскай навелай эпохі Адраджэння. Гэта, па сутнасці, кніга вусная, праз якую перадаецца вопыт. Філасофія быцця. І ў Купалы ёсць гэтае наймагутнае разуменне, светаўспрыманне: хто мы такія на гэтай зямлі? У многіх нашых пісьменнікаў гучаць такія думкі. Але ж пісьменнікі бываюць розныя: бываюць разумнейшыя за свае творы, бываюць такія, хто знешне ніяк не праяўляе свой талент, але ўнутрана працуе — і ў творах глыбіня.

5. НАТУРАЛЬНАСЦЬ

— Чаго, на ваш погляд, нестае сёння сучаснай беларускай літаратуры?

— Натуральнага параджэння таленту ў сваім асяродку, што было ўласціва творцам раней. Прывяду прыклад: для мяне ў школе было дзіўна, што мой бацька гаворыць па-руску, калі прыйшла новая настаўніца. Ніколі ў нас так не гаварылі! Я нарадзіўся на мяжы з Украінай. Мае бацька і маці мелі па чатыры класы польскай школы. А дома ўсё было па-нашаму. Маці і бацька вельмі добра спявалі. Памятаю, на Дзяды бацькі прыносілі сена і клалі пад цырату. Памятаю, як кабана калолі, а я ўцякаў у самы жудасны момант, а потым прыбягаў і падсмальваў вушы. Мы чулі натуральную гаворку. А потым натуральна прыходзіла кніга. Для мяне цыбуля — гэта менавіта «цыбуля», і ніякае іншае слова на розум не прыходзіць. У літаратуры ўсё мае значэнне. Цяпер моладзь пазбаўлена ўнутранага адчування еднасці з роднай зямлёй. Яны, вядома, разумнейшыя за наша пакаленне, больш інтэлектуальныя, і гэта натуральна. Можа, больш рафінаваныя, адпачатку ўжо ведаюць, як і што павінна стварацца. Цяпер усё больш рацыянальна ў людзей, таму больш запатрабаваны малыя формы літаратуры — зручна ў той жа інтэрнэт закінуць. Нават пішуць раманы з SMS-ак...

— Вы рабілі трохтомнае даследаванне творчасці сваіх землякоў, пісьменнікаў Гомельшчыны. Кіраваліся пачуццём патрыятызму?

— Я сам са Століншчыны, з вёскі Беражное — гэта на Гарыні... У нас многа таленавітых людзей. Я асабліва цікаўлюся літаратарамі, якія нарадзіліся на Гомельшчыне. Рыхтуецца да выдання кніжка «Рускамоўныя пісьменнікі Гомельшчыны». Шмат тых пісьменнікаў, якія стваралі па-беларуску. Але са здзіўленнем убачыў, што былі мае землякі, якія пісалі па-польску. Я патрыёт Палесся: асаблівая некранутая тэрыторыя. Наогул Беларусь наша вялікая і вельмі розная. Пад'язджаеш на Міншчыну — елкі растуць. Ёсць лагойская града, ёсць ашмянская града. Ёсць мясцовасць у пагорках. Мы не цэнім тое, што маем. Як пісаў Караткевіч: калі б была мажлівасць, я кожнага б хлопца, які заканчвае школу, адпраўляў: хай пабадзяецца па свеце і ацэніць сваю радзіму.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 5 (134)

Маладая кроў цячэ ў жылах беларускай кінадакументалістыкі

Днямі ў глядзельнай зале Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» адбыўся паказ выбраных дакументальных фільмаў студыі «Летапіс», знятых у 2011 годзе. Усяго ў мінулым годзе «Летапіс» выпусціў 28 дакументальных карцін. Многія з іх — прыклады высокамастацкай працы нашых рэжысёраў, аператараў і сцэнарыстаў.

Беларускія дакументальныя фільмы высока ацэньваюцца на замежных кінафестывалях, гарманічна і якасна выглядаюць у адным шэрагу з фільмамі найлепшых кінадакументалістаў свету.

Сярод самых адметных стужак мінулага года — «Любча. Восем дзён лета» Уладзіміра Дашкевіча пра валанцёрскую працу па аднаўленні помніка беларускай гісторыі Любчанскага замка; «Драўляны народ» Віктара Аслюка пра народнага майстра Беларусі Мікалая Тарасюка; «Кінааматар. Восеньскі сон» Вольгі Дашук пра талачынскага кінааматара, які больш за 50 гадоў здымае на плёнку летапіс роднай зямлі; «Дрысвяты. Песня і лёс» Міхаіла Жданоўскага пра маленькае беларускае мястэчка, дзе жыве і квітнее народная песенная традыцыя, і шмат іншых фільмаў. **Уладзімір МАРОЗ, вядучы рэдактар студыі «Летапіс», адзначае:**

— Мы працягваем ствараць кінапантэон Беларусі — здымаем шмат фільмаў пра выдатных асоб нашай гісторыі і культуры. Летась з'явілася карціна Юрыя Цімафеева пра доктара тэалогіі і прафесара Віленскага ўніверсітэта , ідэйнага настаўніка філаматаў і філарэтаў Міхаіла Баброўскага. Выйшлі выдатныя карціны «У пошуках новай зямлі» Яўгена Сяцько пра Якуба Коласа, «Максім і Дар'я» Дар'і Ромы (Юркевіч) — рэфлексіі аўтара пра Багдановіча, фільмы пра каханне Барбары Радзівіл і Жыгімонта II, пра дзеяча беларускага нацыянальнага адраджэння Браніслава Эпімах-Шыпілу (1859—1934).

Сапраўды, у айчынным кіно, як ні круці, пакуль лідзіруе дакументалістыка. Менавіта яе хочацца пераглядаць, распавядаць пра яе іншым. Пакуль што «дакументалка» — гэта наша ўсё ў кіно. Чаму так атрымліваецца, тлумачыць **Ірына ДЗЯМ'ЯНАВА, вядучы рэдактар студыі «Летапіс» УП «Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм»:**

— Нельга сёння гаварыць пра школу беларускага дакументальнага кіно. Але некалі яно сапраўды было вельмі моцным. Прычым праявіла сябе нават не тады, калі ў значнай ступені вызначала грамадскую думку, гэта значыць, у гады «перабудовы». А ў 1960-1970 гг., калі ў Беларусь прыязджалі выпускнікі ВНУ розных краін — вельмі цікавыя маладыя рэжысёры. Яны прывозілі з сабой новую жыццёвую энергетыку, вітальныя сілы. І тады ж нашы фільмы перамагалі на многіх міжнародных кінафестывалях, прычым вельмі высокага класа. Працягам гэтага можа служыць праца ўжо канкрэтных рэжысёраў у 1980-1990-я гг., калі на студыю прыйшлі першай беларускай майстэрні дакументальнага кіно. Яны таксама вучыліся, выхоўваліся ў традыцыях лепшых фільмаў беларускай школы. Гэтыя сувязі яшчэ жывыя.

Калі гаварыць пра 2011 год — мы вельмі рады, што на студыю «Летапіс» прыйшлі маладыя рэжысёры, выпускнікі нашай Акадэміі мастацтваў: Дар'я Юркевіч, Наталля Жамойдзік, Марыя Жукава, Ігар Чышчэня, Уладзімір Мілаш, Ксенія Мар'янкова, Андрэй Куціла. Пакуль мы ставім перад імі задачы даволі сціплыя, і пачынаюць яны з кароткаметражак. Але ў іх іншы погляд на свет і кіно, яны прадстаўнікі іншага пакалення, носьбіты новай ментальнасці.

Пераемнасць пакаленняў у любой справе — рамяство або мастацтве — рэч, бадай, самая важная. Без прытоку маладой крыві няма жыцця. А таму за беларускую дакументалістыку можна толькі парадавацца і паспадзявацца, што яна атрымае таленавіты працяг у творах маладых рэжысёраў.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Прэм'ера

«МІЛЬЁН ПАКУТ» ДЛЯ «ЛІШНІХ ЛЮДЗЕЙ», альбо Чаму дзяўчаты «клююць» на абаяльных кар'ерыстаў?

Як справядлівы і сумленны чалавек можа лёгка стаць вар'ятам у вачах свету, і чаму маўклівы, але хітры ціхоня можа дасягнуць «ступеняў вышэйшых»?.. Пытанні амаль 200-гадовай даўніны. Але гучаць, нібыта перад намі пастаўленыя. Напярэдадні Новага года Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага зрабіў падарунак тэатралам — пастаноўку «Гора ад розуму» Аляксандра Грыбаедава.

Рыса спектакля, які паставіў рэжысёр Сяргей Кавальчык, — стрыманае спалучэнне традыцыйнага і наватарскага. Так, героі апрануты ў шыкоўныя строі эпохі Аляксандра I (касцюмы створаны Марыяй Герасімовіч), аднак дзейнічаюць на фоне дэкарацыі, якая ўвасабляе і парадную браму, і чыноўніцкі мундзір (сцэнаграфія Алы Сарокінай). Калі ж вялізны фрагмент мундзіра адсоўваецца, бы заслона, то адкрываецца пахілены драўляны плот, што суседнічае з прыгожай агароджай. Такое кідкае суседства раскошы і безнадзейнага жабрацтва, здаецца, адвечна ўласцівыя славянскаму менталітэту.

У кожным спектаклі Сяргея Кавальчыка ёсць акцёр, які, выконваючы нават не галоўную ролю, становіцца найбольш прыцягальнаю асобай. У «Гора ад розуму» такім «магнітам» мне падаўся Уладзімір Глотай, які выконвае ролю Малчаліна. Насуперак хрэстаматыйнаму тлумачэнню гэтай ролі ў падручніках, маўляў, Малчалін — гэта сімвал маральнага рабства ды крывадушнасці, акцёр стварае абаяльны вобраз чалавека, якому ад нараджэння наканавана поўзаць у ніжэйшых чынах, але ён не мірыцца з такім лёсам і нетаропка рухаецца да «ступеняў вышэйшых». Глотаўскі Малчалін добра ўсведамляе, што яго старанна ніхто належным чынам не ацэніць, дык імкнецца да поспеху больш дзейсным чынам, абы пасунуцца па кар'ернай лесвіцы.

Чацкі (артыст Антон Бельскі) закаханы ў Соф'ю (Веранікa Пляшкевіч), а тая не адказвае яму ўзаемнасцю, бо палае страсцю да Малчаліна, які пазбягае небяспечных стасункаў з дачкой свайго дабрадзея Фамусава і круціцца вакол Лізанькі, якая закахана ў Пятрушку (яго грае Аляксей Сянчыла). У выніку ўсе няшчасныя, бо кожны кіруецца толькі ўласнымі жаданнямі і нават не спрабуе зразумець прычыну чужых памкненняў.

На мой погляд, рэжысёр удала апісаў сутнасць кахання Чацкага да Соф'і, увёўшы ў спектакль персанажаў, якіх няма ў тэксце п'есы — малых Чацкага (Валянцін Козыраў) і Соф'ю (Еўдакія Сарокіна). У першым акце яны дэманструюць гулі даўно мінулых дзён, моўкі сведчаць, як нараджалася каханне галоўных персанажаў. А ў фінале з'яўляюцца як увасабленне страчанай чысціні пачуццяў, як сумны напамін пра незваротны сыход «залатой пары» жыцця.

Антон Бельскі выкрышталізаваў у сваім персанажы галоўную рысу — ягоны герой жыве з абвостраным пачуццём справядлівасці, успрымае навакольны свет адкрытым сэрцам. Ягоны Чацкі не занадта разумны, але занадта сумленны. Калі ўсе наўкол спрабуюць нейкім чынам урваць хоць бы кавалак шчасця (і тым псуюць сабе жыццё), то гэтаму герою соромна быць шчаслівым, калі навакольны свет недасканалы. Каб Чацкі не атрымаўся аднамерны, Антон Бельскі надае яму нязграбнасці ў жэстах і руху. Напрыклад, герой не патрабаваў, а змучана прасіў у фінале карэту і, сыходзячы, няўклюдна каўзануўся. Ад такіх дробязяў вобраз Чацкага страчвае залішнюю пафаснасць, затое выклікае сімпатыю і спачуванне.

Такі тып чалавека (у хрэстаматыйнай крытыцы названы «лішнім чалавекам») прысутнічаў у грамадстве ва ўсе часы. Таму не старэюць апісаныя Грыбаедавым «мільён пакутаў», а рэплікі персанажаў гучаць афарызмамі на злобу дня.

Мне здаецца, галоўны рэжысёр тэатра імя Горкага Сяргей Кавальчык здолеў распавесці гісторыю, сугучную светаадчуванню сучаснага гледача.

Ягор КОНЕЎ.



Яўгена ПЯСЕЦКАГА
фота слова

Ні ветразя, ні якара няма.
Бяздомнік-вецер у адвечнай згодзе.
Плыве палац на ўснежаных палях
Па хвалях дваццаць першага стагоддзя.
На ім сляды бязлітасных завей,
Прад ім грувасцяцца сумёты ў горы —
Плыве палац, як прывід-карабель,
Нязможаны вандроўнік у прасторы.
З якіх сівых часоў ягоны шлях?
У гавані якой вясну спаткае?
Плыве палац ў лядовых кайданах,
І неадлётны птах яго вітае.

(Гэтыя фотаздымкі зроблены некалькі дзён таму на месцы, дзе адраджаецца Ружанскі палацавы комплекс — архітэктурны скарб, напамін пра старажытны род Сапегаў.)

«ДРЫГВА» ЗАЦЯГВАЕ!

Крыніца кіно — у літаратуры

Афіцыйна адкрыць Год Якуба Коласа выпала 4-серыйнаму тэлевізійнаму фільму «Талаш», знятаму на «Беларусьфільме» паводле аповесці пісьменніка «Дрыгва».

Вось ужо колькі гадоў беларускае кіно не звярталася да айчыннай літаратуры. Экранізацыі, здавалася, паціху сыходзілі ў нябыт. Наш кінематограф спрабаваў шукаць сучасных герояў, новыя тэмы. Але аказалася, што не трэба нічога шукаць. У беларускай літаратуры ўсё пра нас ужо даўно напісана — хто мы ёсць, адкуль ідзём. Трэба толькі ўмець чытаць і асэнсоўваць.

Па-свойму прачытаў «Дрыгву» Якуба Коласа кінарэжысёр Сяргей Шульга.

У выніку атрымаўся 4-серыйны фільм паводле аповесці Коласа. Гэты твор беларускі пясняр напісаў у 1933 годзе. І тут усё невыпадкова: ні час напісання, ні час дзеяння. Дзеянне, дарэчы, разгортваецца ў 1920-1921 гг. на Палессі. Ідзе савецка-польская вайна. Галоўны герой — Васіль Талаш — стварыў на Палессі партызанскі атрад, які дапамагаў Чырвонай Арміі змагацца з заходнімі ворагамі за светлую будучыню. Насамрэч у Талаша былі і свае рахункі — паводле фільма, палякі забілі яго 12-гадовага сына...

Нядаўна адбылася прэм'ера тэлевізійнага серыяла «Талаш» на беларускім тэлебачанні. Пасля гэтага ў нашых гледачоў з'явілася шмат тэм для абмеркавання — беларускі кінематограф працягвае заяўляць пра сябе. «Талаш» выклікае дыскусіі хаця б таму, што зняты на беларускай мове (там, дзе вынікае з кантэксту, ужываецца яшчэ руская і польская). Спадзяёмся, што беларускамоўныя фільмы будуць з'яўляцца і надалей, а беларускія кіна- і тэлегледачы змогуць правільна прачытаць гэты несмяротны «код нацыі».

Як гаворыць Сяргей Шульга, для яго было прынцыпова зрабіць фільм беларускамоўным. Як было прынцыпова і тое, што ролю дзеда Талаша выканае народны артыст Беларусі Генадзь Гарбук. Менавіта Гарбук падказаў рэжысёру ідэю экранізаваць гэты твор Якуба Коласа. Сыграць Талаша было даўняй марай артыста. Паводле слоў рэжысёра, дзед Талаш, вядома, з'явіўся не на пустой глебе і сваім прататыпам мае рэальную гістарычную асобу. Але кінагерой — гэта мастацкі абагульнены вобраз народнага мсціўцы, які ўвасабляе ў сабе ўсіх барацьбітоў за свабоду нацыі.

Кадр з фільма «Талаш».

Генадзь Гарбук сутыкаўся з творчасцю Якуба Коласа тройчы. Першы раз у 1959 годзе ў віцебскім тэатры імя Якуба Коласа: у спектаклі «Подых навальніцы» Юрыя Шчарбакова Гарбук іграў Тукалу. Другі раз — дзеда Курылу ў пастаноўцы «Сымон-музыка» Купалаўскага тэатра. Трэці раз — у фільме Сяргея Шульгі.

— Бог тройцу любіць, — прыгаворвае Генадзь Гарбук. — Але за гэтую ролю мне было вельмі страшна брацца. Такая адказнасць! Талаша наогул толькі аднойчы ўвасабляў акцёр. Гэта было ў 1930-х гг. у Беларускім драматычным тэатры ў Віцебску. Талаша іграў выдатны Аляксандр Ільінскі. Ён нават сустракаўся з самім Васілём Талашом. А мяне падбадзёрвала толькі тое, што ўжо наўрад ці шмат засталося людзей, якія памятаюць тую бліскучую ігру Ільінскага...

Цікава, што першапачаткова серыял мусіў складацца з васьмі серый. У тым варыянце нават Пілсудскі прыязджаў у Мінск на браняпоездзе... Па розных прычынах фільм давялося скараціць да чатырох серый. Але нават і ў такую працягласць змясцілася багата гістарычнага матэрыялу, над якім можна разважаць і разважаць.

«Талаш» выйшаў на экраны акурат у год святкавання 130-годдзя Якуба Коласа. Кіно — найбольш захапляльная форма мастацтва для сучаснага чалавека. Магчыма, дзякуючы гэтаму фільму хтосьці захоча звярнуцца да творчасці і біяграфіі Коласа больш падрабязна. Паверце, там сапраўды ёсць шмат нечаканага.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже неиспользуемого имущества с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине

Наименование неиспользуемого имущества	**Изолированное помещение (аптека № 131)**
Местонахождение неиспользуемого имущества	Брестская обл., Ганцевичский р-н, д. Денисковичи, ул. Мира, 1
Продавец неиспользуемого имущества	Брестское ТПРУП «Фармация», тел.: 80162 41 60 10, 41 69 50
Сведения о неиспользуемом имуществе	Изолированное помещение в 2-этажном здании 1976 г.п., площадь – 168,1 кв.м (2-й этаж).
Обязательные условия аукциона	- осуществление покупателем предпринимательской деятельности на объекте и создание им дополнительных рабочих мест (два и более) в течение двух лет; - запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи
Начальная цена неиспользуемого имущества, базовая величина	1
Сумма задатка, базовая величина	1
Организатор аукциона	**Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: 80162 20 87 85, 23 12 63, www.brest-region.by**

Аукцион состоится **13 марта 2012 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе.

3. Негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии.

4. Иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель), уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня утверждения организатором аукциона протокола аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, после чего не позднее 2 рабочих дней в установленном порядке заключить с продавцом договор купли-продажи неиспользуемого имущества.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденной постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11 марта 2010 г. № 342.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням с 13 февраля 2012 г. по 12 марта 2012 г. включительно.

Пряльницкий сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец) ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 4 (четырех) земельных участков для индивидуального жилищного строительства в следующих населенных пунктах:

Аукцион состоится 14 марта 2012 года в 12.00

Лот 1 — земельный участок № 1 в деревне Курдуны, площадь участка — 0,2500 га, кадастровый номер 622084604101000088, начальная цена 12 000 000 белорусских рублей.

Лот 2 — земельный участок № 2 в деревне Курдуны, площадь участка — 0,2500 га, кадастровый номер 622084604101000089, начальная цена 12 000 000 белорусских рублей.

Лот 3 — земельный участок № 3 в деревне Галимцы, площадь участка — 0,1659 га, кадастровый номер 622084602601000121, начальная цена 11 000 000 белорусских рублей.

Лот 6 — земельный участок № 6 в деревне Галимцы, площадь участка — 0,2493 га, кадастровый номер 622084602601000113, начальная цена 16 500 000 белорусских рублей.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 09.03.2012 года до 17.00

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Победитель аукциона обязан: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка перечислить на расчетный счет 3600614130508, в ЦБУ № 605 г. Воложина филиала № 500 МОУ АСБ «Беларусбанк» код банка 601, город Воложин, ул. Партизанская, 13, назначение платежа 04901, УНП 600059273, Пряльницкий сельский исполнительный комитет.

Аукцион состоится по адресу:

деревня Пряльники, ул. Молодежная, дом 3, помещение Пряльницкого сельисполкома.

Контактные телефоны: (8 01772) 31233, 31235, 31236, сайт в интернете: volozhin.gov.by

Заседание совместного внеочередного Общего собрания участников ООО «Евроторг» и внеочередного Общего собрания акционеров ОАО «Слепянка» будет проводиться по адресу: г. Минск, ул. Менделеева, 1/17 20.02.2012 г. в 11.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об установлении порядка проведения голосования по вопросу внесения дополнений в устав ООО «Евроторг» и их утверждении.
2. О внесении дополнений в устав ООО «Евроторг», их утверждении и представлении для государственной регистрации.
3. О выплате акционерам ООО «Слепянка» стоимости принадлежащих им акций.

УНП 100199509

У **суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобл.** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Адзінца Дзмітрыя Пятровіча,** 29 чэрвеня 1981 года нараджэння, ураджэнца г. Рэчыца, Гомельскай вобл., які пражываў у г. Рэчыца па вул. Дастаеўскага, д. 37, кв. 52, са снежня 2003 г. ніякіх звестак аб ім няма. Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Адзінца Дзмітрыя Пятровіча, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.



ГАТАВАЛА — ЯК САБЕ...

...НАСТАЎНІЦУ рускай мовы і літаратуры мы, дзяўчынкі, звалі за вочы Леначкай, бо вельмі ж любілі — яшчэ і за тое, што яна была проста эталонам: вельмі стыльна, вельмі хораша заўжды апраналася.

Муж яе (светлай памяці!) таксама ўсё жыццё працаваў у школе і нават калі сышоў на пенсію, яго інакш як «дырэктар» ніхто ў наваколлі не зваў.

А яшчэ ў іх хату заўсёды прыходзіла і прыходзіць газета «Звязда». Таму любімая настаўніца і цяпер сочыць за маімі публікацыямі...

Распавяла вось сваю «вясёлую і праўдзівую гісторыю», сказала: «А ўжо як яе іншым падаць, ты і сама ведаеш». То паспрабую апраўдаць давер...

У апошні час гумарысты любяць пацяшацца з фізрука, з настаўніка працы. А некалі гэтыя двое былі такімі ж паважанымі, як і іншыя, бо менавіта яны закладвалі аснову будучых працоўных рэзерваў, здольных «дагнаць і перагнаць Амерыку».

Для таго, каб яна, гэтая аснова, была трывалай, для дзяцей арганізоўвалі шматлікія спартыўныя секцыі, а ў школьных майстэрнях ставілі такарныя і нават фрэзерныя станкі. Ставілі, вядома ж, не для таго, каб яны прастойвалі... А тым больш, калі попыт ёсць... І не толькі ў дзяцей. Карпавіч, наш «трудавік», чаго не рабіў на іх — і школе, і сабе: то нешта з мэблі, то вокны, то дзверы...

Дырэктар, вядома ж, ведаў, што эксплуатуецца школьнае абсталяванне. І не толькі для вучобы дзяцей... Але ж не на шкоду... І таму, як чалавек з галавой, заплюшчваў вочы: няхай сабе...

Вось за гэтую дабрыню Карпавіч і вырашыў яму аддзячыць, гэта значыць, пачаставаць. Тым больш і нагода на тое была: адна гаротніца-бабулька папрасіла яго, каб дзверы зрабіў, і не абы-якія, а філёнгавыя. Работа гэта дорага каштавала, але ж Карпавіч сказаў, што з бабулькі грошай не возьме, хіба магарыч.

На яго якраз запрасіў і дырэктара.

Згадзіўся той (хіба ж ён не мужчына?!), але ж помніў, што найперш — настаўнік, а значыць, не да твару ім па нейкіх выпіўках хадзіць.

Вечарком пайшлі, каб ніхто не бачыў. А бабулька нешта пераблытала, чакала іх толькі назаўтра: яна халадзец зварыла — з печы выняла, па місках разлівае, а тут людзі на парог. Расхвалявалася старэнькая, замітусілася: маўляў, сядайце ж, госцікі, паешце халадца — ну хоць гарачага... Удаўся ён!.. Як сабе гатавала! Вось толькі часначку зараз...

На гэтым слове гаспадынька матнулася да печы — ухапіла там некалькі зубчыкаў і на... зуб (ён у бабулі толькі адзін быў — напарадзе...). А далей... Не паспелі «госцікі» вокам міргнуць, яна, як той заяц, раз-раз-раз — ужо здрабніла той часначок, у кулак яго — і ў міску плюх. Яшчэ лыжкай пабоўтала, сербанула:

— Смаката, — кажа. Чаркі ставіць, пляшку «магазіннай», халадзец бліжэй падсоўвае. — Выпіце, хлопчыкі, ды прыкусіце во...

Праўду кажуць «хоць сабачына, абы вока не бачыла»: каб не бачылі хлопцы тое бабульчына прыгатаванне, можа, і елі б той халадзец — за мілую душу. А так...

Зніякавелі абодва — ні піць, ні закусваць не хочацца. Карпавіч давай назад адступаць: маўляў, пажартаваў ён пра магарыч, проста так зайшоў, а што з дырэктарам, дык той хацеў паглядзець, ці добрыя дзверы атрымаліся... А наогул яны спяшаюцца, на педсавет зараз трэба... Каб уважыць гаспадыню, хіба што пляшку возьмуць — можа, спатрэбіцца калі.

Так і сышлі.

А бабулька потым доўга ганарылася — паказвала, якія ж добрыя дзверы зрабіў ёй Карпавіч! І які ж ён сам чалавек — «ні капеечкі з яе не ўзяў. Ведама, настаўнік!».

Пра пляшку яна тактоўна маўчала — няўжо ж яна не культурная, няўжо ж не разумее, што аўтарытэт настаўніка можна толькі мацаваць?

Соф'я КУСЯНКОВА,
в. Лучын, Рагачоўскі раён.

СНАЙПЕР!

НЕЯК у суботу, пасля цяжкіх працоўных будняў, трое сяброў — Мікола, Міхась і Кастусь — вырашылі адпачыць — парыбачыць. І не абы-дзе, а на Браслаўскіх азёрах. Было ў іх там улюбёнае месца.

...Калі пад'ехалі, убачылі, што яны далёка не першыя, на лёдзе ўжо сядзелі дзясяткі са два такіх жа аматараў-рыбаловаў. Сябрукам нічога не заставалася, як далучыцца. Хуценька зрабілі лункі, закінулі вуды, сталі дыханне.

Калі ўдача любіць рыбака, то чакаць улову доўга не даводзіцца. Мікола першым выкінуў на лёд трапяткога карасіка і чмокнуў яго ў нос — на шчасце. Гэта, відаць, спрацавала — праз гадзіну каля ног сяброў ляжала з дзясятак рыб даўжынёю з добрую далонь. Працэс ішоў! А далей жа болей... Міхась во раптам замёр, напружыўся, рэзка тузануў вудачку...

Ды дзе там: галава сазана проста... не змяшчалася ў лунцы: там быў толькі вялізны разяўлены рот.

Міхась з усіх сваіх сіл трымаў удачу на кручку. Мікола з Кастусём кінуліся да яго на падмогу. Аднак што ж рабіць? Расшыраць лунку? Не, гэта не тое...

Нехта з сябрукоў успомніў, што ў машыне ёсць пнеўматычная стрэльба. Значыць, можна скарыстацца ёй — забіць рыбу...

Кастусь куляй паляцеў да машыны. Метраў трыста туды, потым як дуж назад...

Ад хвалявання і хуткага бегу рукі і ногі трэсліся. Таму на месцы прыйшлося трохі счакаць, перавесці дух, супакоіцца, каб добра прыцэліцца і...

— Ба-бах! — разнеслася па наваколлі.

Над лункай узняўся высокі фантан...

Што сазан?

Махнуў хвастом на развітанне — і знік.

Сябрукам — ад нечаканасці — мову адняло.

— Гэта ж першы раз на мой кручок такая ўдача трапіла, — непрыкаяным голасам зацягнуў потым Міхась, — а ты... Ты ўсё сапсаваў... Стралок знайшоўся: у разяўленую ляпу пацэліць не мог, а лёску — перабіў... Снайпер хрэнаў...

Аднак сварыцца школьным сябрам не выпадала, бо за плячыма ў іх аж лажыліся ад смеху рыбакі, што назіралі гэтую сцэну...

Смяяліся, праўда, нядоўга, бо рыба ў той дзень клявала і клявала, як ніколі. «Мабыць, той сазан пахваліўся, як яго тут сустракалі, які ў яго гонар салют быў. Вось і іншым стала цікава», — жартавалі сябры, дастаючы рыбіну за рыбінай.

Гэта, вядома ж, кампенсавала страту, хоць, як той казаў, і не ў поўным аб'ёме.

Галіна НІЧЫПАРОВІЧ,
в. Магільна, Уздзенскі раён.

ЛАРЫСЧЫН ТАТА

ХТО пра каго, а я дык яшчэ раз пра Івана, які дапіўся да таго, што («Звязда» за 1.02.12) стаў апраўляцца «жывым «чарнілкам».

Дык, значыць, неяк выпіваў ён дома, частаваў свайго аднавяскоўца Васіля. І не сказаць, што вельмі шмат яны «на грудзі ўзялі», але ж трэба госцю дадому ісці, на другі канец вёскі, а ногі не тое каб несці яго, нават трымаць не хочуць. Што тут рабіць?

— Ды заставайся ў мяне, — запрасіў Іван. — Госць лаву не праседзіць, канапу не пралежыць.

Што пры гэтым думала жонка яго, здагадацца няцяжка — нават Івану. Таму ён, каб хоць трохі падлізацца, на досвітку падхапіўся і гайда дапамагаць ёй, гаспадарку пыніць.

А далей...

Можа, захапіўшыся, на скаціну закрычаў, можа, бразнуў чым — пабудзіў у хаце дзяцей. Сынок малы, прынамсі, прачнуўся, бачыць — на канапе нейкі дзядзька ляжыць. «Хто ж гэта такі?», — думае. І — ведама, дзіцячы розум — мяркуе так: «Гэта ж іх, малых, у хаце двое — ён і сястрычка, Ларыска. Дык, значыць, і татаў павінна быць двое?..»

Ён, як старэйшы, сабе лепшага выбраў — свайго, значыць, роднага. А вось гэтага, новага, вырашыў сястрычцы «аддаць». Так на ўсю хату і абвясціў:

— Мой татка ўжо ўстаў, аглядаецца, а Ларысчын яшчэ спіць...

Іван — мужык з гумарам і без комплексаў. У тую ж раніцу пра гэта сынава «размеркаванне» распавёў сябрам. Парагаталі... Ды каб толькі, а то ж мянушку прыклеілі: варта цяпер некаму загаварыць пра Васіля (у нас вёскі вялікія), адразу ўдакладняюць: «Гэта ж каторы? Ларысчын тата?»

Той, кажуць, не супраць — пакуль: хай завуць... Абы аліментаў не спагнялі.

І.М., *Ганцавіцкі раён.*

ДАВЯРАЙ ДЫ ПРАВЯРАЙ

ВАСІЛЬ — муж маёй сяброўкі — чалавек спакойны, разумны, а ўжо акуратны... У гаражы, прынамсі, у яго парадак такі, як у найлепшай гаспадыні ў кухні. І чысценька там, і акуратненька, у кожнага інструмента — месца, у кожнай гаечкі свая бляшаначка, у кожнай бляшаначкі — палічка...

Такі ж гэты чалавек і ў жыцці. Сяброўка за ім — як за каменнай сцяной, бо ён ніколі не праспіць, нічога не забудзецца, не згубіць... Адзінае, што дрэнна: не разумее, як гэта наогул можна?!

Аднак жа і з ім, вось такім... акуратным, разумным, прадбачлівым — інцыдэнт адбыўся, ледзьве пережыў!

Паехаў ён аднойчы з жонкай і дачкой на машыне да сваякоў за дзвесце вёрст. Пагасцілі там, вяртаюцца дамоў, а па дарозе зрэдку спыняюцца, у крамы заходзяць, бо трэба ж абувацца, апранацца, а купіць нешта людскае па тым часе вельмі цяжка было. Асабліва — людзям пажылым: Васілёва маці што-небудзь на ногі сабе хацела — на нізкім хаду, з шырокімі насамі, каб костачкі не муляла...

То вось спыняюцца яны ў чарговы раз у Слуцку. Горад гэты немалы, універмаг — пры дарозе.

Гаспадар з машынай на плошчы застаўся, а жонка з дачкой у краму пайшлі. Што-кольвек купілі там — вяртаюцца назад. Здалёк бачаць: Васілю нейкі мужчына руку паціскае (ці то дзякуе за што, ці то адвітваецца?), потым садзіцца ў свайго «Масквіча» і хуценька з'язджае.

Ну, ці мала што? Можа, знаёмец які...

Падыходзяць яны, у сваю машыну кладуць пакупкі, садзяцца ехаць, а машына... не заводзіцца. Што за ліха?! Спраўная ж, толькі што ўсё нармальна было...

Васіль выходзіць, падымае капот і...

Аказваецца, пакуль «дзеўкі» яго ў краме былі, да машыны падышоў той незнаёмец — папрасіў акумулятара, каб свайго «Масквіча» завесці. І прыстойна ж выглядаў... Ды і гадзіннік зняў са сваёй рукі, на сядзенне яму палажыў — маўляў, гарантыя, што не ўцяку.

І сапраўды — не ўцёк: завёўшы сваю машыну, аддаў акумулятар — але... свой, няспраўны. За гэта, відаць, і руку паціснуў...

Зразумеўшы, што адбылося, Васіль то бялеў, то чырванеў — жонка баялася глядзець на яго, але ж, як магла, разважала, казала, што нічога ж такога не адбылося: усе яны жывыя-здаровыя, машына цэлая. Неяк жа завядуць... Тым больш што тут, у Слуцку, іх сваяк жыве. І таксама машыну мае...

Мабільных (ды што там — проста тэлефонаў) тады няшмат было, таму жонка праз увесь горад паехала да сваяка — стала прасіць, каб памог.

Той, вядома ж, не адмовіў, але ўсю дарогу, пакуль ехаў на выручку, аж захадзіўся ад рогату, бо абдурылі ж — лёгка, прыгожа, а галоўнае, каго? Васіля — такога разумнага, такога акуратнага...

Аднак жа гонар яго пашкадаваў: на пад'ездзе да той плошчы супакоіўся, як нічога ніякага падчапіў машыну на буксір, «выцягнуў» за горад. А адтуль, нідзе не спыняючыся, яны ўжо дабраліся дадому.

Валянціна ПАБЯГАЙЛА,
г. Ляхавічы.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж... Прыемная навіна: у Валянціны Іванаўны Пабягайла, нашай пастаяннай падпісчыцы і чытачкі з «падачы» «Звязды» выйшла кніжка «Паміж вясной і восенню». Аўтарцы — найшчырэйшыя віншаванні, чытачам — яе верш:

Паштоўку атрымала ў канверце,
На ёй — хіба з дзясятак слоў:
Мамуля, ты найлепшая ў свеце!
Прымі ж маю ўдзячнасць і любоў.

Перачытала, можа, сто разоў,
Ліліся слёзы — не маглі спыніцца...
Я вочы падняла да абразоў
І пачала паціхеньку маліцца:

«Мой Божа, я ўдзячная табе
За тое, што жыву на гэтым свеце,
За дні шчаслівыя і дні ў барацьбе,
За словы, што прыйшлі мне
ў канверце».

То, калі ласка, пішыце. І дасылайце. Напісанае застаецца.

Пытальнік

Мэты выкарыстання «Маёмасці» — тыя ж

Добры дзень! Прачытала ў вашай газеце пра чэкі «Жыллё». Мае бацькі жывуць у вёсцы. У свой час атрымалі чэкі «Маёмасць», але да гэтай пары іх не выкарысталі. Што з гэтымі чэкамі цяпер рабіць? Буду вельмі ўдзячная вам за адказ на маё пытанне.

А. ШВЕД, *Баранавіцкі раён*

Пытанне крыху, прабачце, дзіўнае — як быццам бы чалавек толькі што даведаўся пра існаванне памянёных чэкаў. Між тым у свой час інфармацыя пра «Маёмасць» гучала, вобразна кажучы, ці не з кожнага праса. І з таго часу нічога — мы маем на ўвазе парадак абарачэння і выкарыстання імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» — не змянілася. Адзінае, што адбылося параўнальна нядаўна, дык гэта падаўжэнне пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб тэрмінах абарачэння імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» ад 19.05.2010 г. № 749 тэрміну абарачэння каштоўных папер — па 30 чэрвеня 2013 года. Такі крок рабіўся дагэтуль ужо неаднойчы, але на гэты раз заяўлена, што ён — апошні, больш чэкавай прыватызацыі не будзе.

Такім чынам, да ўказанай вышэй даты, грамадзяне могуць выкарыстаць належныя ім у адпаведнасці з артыкулам 11 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб імянных прыватызацыйных чэках Рэспублікі Беларусь» каштоўныя паперы, а менавіта: прадаць; перадаць у распараджэнне даверанай асобы; атрымаць у спадчыну і завяшчаць ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку; выкарыстоўваць пры набыцці дзяржаўных аб'ектаў (акцый, доляў, паёў у маёмасці такіх аб'ектаў), што прыватызуюцца.

Калі грамадзянін выбраў кірунак выкарыстання чэкаў, неабходна звярнуцца ў аддзяленне філіяла ААТ «ААБ Беларусбанк» па месцы выдачы сертыфіката імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць», каб выканаць аперацыю, якая зацікавіла. Калі прынята рашэнне аб абмене чэкаў на акцыі прадпрыемстваў, можна азнаёміцца з пералікам прадпрыемстваў, што прыватызуюцца, на інфармацыйным стэндзе аперацыйнага аддзела названага філіяла і выканаць аперацыю абмену. Пры абмене пакупнік павінен прад'явіць пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць асобу, і сертыфікат чэкаў «Маёмасць». Тут жа маюцца праспекты эмісіі, у якіх змяшчаецца падрабязная інфармацыя пра дзейнасць гэтых прадпрыемстваў.

І тчэ, забыўшыся, рука...

Лідчан і гасцей горада, якім хочацца не толькі азнаёміцца са старажытнымі беларускімі тэхналогіямі ткацтва і ганчарства, але і самім авалодаць адпаведнымі прыёмамі, запрашае Лідскі раённы цэнтр рамёстваў і традыцыйнай культуры «Спадчына».

Кожнага ахвотнага таксама навучаць перапрацоўваць лён у нітку на старажытных прыладах, а таксама тэхніцы пляцення беларускіх паясоў. Да ўвагі наведнікаў — прадстаўленне тэатра «Батлейка», музычная п'еса «Цар Ірад», традыцыйныя зімовыя гульні і забавы.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

на право заключения договоров аренды земельных участков и по продаже земельных участков в частную собственность.

Организатор аукциона – Каменецкий районный исполнительный комитет

№ лота	Местоположение земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Назначения земельных участков в соотв. с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Срок аренды, лет	Характеристика расположенных на участке строений, инженерных коммуникаций	Начальная цена объекта, руб.	Сумма задатка, руб.	Сумма подлежащих возмещению затрат на оформление и регистрацию участка, руб.
1	Брестская обл., Каменецкий район, дер. Маковище, 23	124082007601000021	0,1186	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), (код 1 09 02)		Земельный участок с наличием транспортной инфраструктуры. На площади 0,0024 га имеются ограничения прав в использовании земель в охранной зоне линии электропередачи напряжением 0,4 кВ	1 820 980	364 200	1 228 415 Кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ
2	Брестская обл., Каменецкий район, дер. Дмитровичи, ул. Октябрьская, 45«а»	124082006101000178	0,2463	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), (код 1 09 02)		Земельный участок с наличием инженерной и транспортной инфраструктуры. Ограничение в использовании на площади 0,0067 га в охранной зоне линии электропередач напряжением 0,04 кВ	4 622 070	924 420	1 051 211 Кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ
3	Брестская обл., Каменецкий район, Дмитровичский с/с, в 0,12 км северо-восточнее аг. Дмитровичи	124082000001000042	0,6371	Для строительства комплекса придорожного сервиса (гостиница с придорожным кафе)	Для размещения объектов иного назначения, (код 1 16 00)	25	Участок представлен естественными луговыми землями. Подъезд к объекту будет осуществляться с автодороги обход территории НП «Беловежская пуща» на уч. Песчатка – Свислочь.	2 213 193	442 640	1 537 724 Кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ

1. Аукцион состоится *15.03.2012 г. в 14.30* в здании Каменецкого районного исполнительного комитета (зал заседаний) по адресу: Брестской обл., г. Каменец, ул. Брестская, д. 9.

2. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить **в аренду**, а также документ, подтверждающий внесение суммы задатка. Сумма задатка для участия в аукционе перечисляется в срок *до 12.03.2012 г.* на расчетный счет Каменецкого районного исполнительного комитета 3641370240068, *ЦБУ № 115 филиала № 100 Брестского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 150501246, УНП 200056317, ОКПО 04062400.*

Для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Для участия в аукционе гражданин, юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые они желают приобрести **в частную собственность,** а также документ, подтверждающий внесение суммы задатка. Сумма задатка для участия в аукционе перечисляется в срок *до 12.03.2012 г.* на расчетный счет Каменецкого районного исполнительного комитета 3641370240068, ЦБУ № 115 *филиала № 100 Брестского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 150501246, УНП 200056317, ОКПО 04062400.*

Для участия в аукционе представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность.

3. Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона:

3.1. на право заключения договоров аренды земельных участков:

- внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;

- возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;

- заключение победителем аукциона с исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и в двухмесячный срок после принятия решения исполкома о предоставлении ему земельного участка осуществление государственной регистрации права на земельный участок;

- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведении проектно-изыскательных работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 (два) года;

- использование земельного участка не позднее шести месяцев после разработки и утверждения строительного проекта и получения разрешения на строительство;

- снятие на земельном участке плодородного слоя почвы и использование его согласно строительному проекту;

- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

3.2 по продаже земельных участков в частную собственность:

- внесение победителем аукциона платы за земельный участок;

- возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;

- осуществление победителем аукциона в двухмесячный срок после принятия решения исполнительного комитета о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;

- получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

- занятие (освоение) земельного участка не позднее 1 (одного) года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него.

4. Заявления на участие в аукционе принимаются с момента размещения извещения о проведении аукциона в СМИ ***в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: Брестская обл., г. Каменец, ул. Брестская, д. 9, каб. 6. Прием заявлений заканчивается 12.03.2012 г. в 14.30. Контактный телефон: (801631) 24299.***

5. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан оплатить стоимость объекта продажи, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в том числе затраты, связанные с изготовлением и предоставлением участникам необходимой документации.

6. Аукцион проводится при наличии не менее двух участников.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительного осмотра земельных участков. **Контактные телефоны: (801631) 23783, 24299.**

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Паважаная **Наталля Аляксандраўна ВІНЧЭЎСКАЯ** са Слуцка, намеснік дырэктара Цэнтра занятасці насельніцтва, шчырая, добразычлівая, абаяльная, тактоўная! Прыміце нашы сардэчныя віншаванні з нагоды дня нараджэння! Зычым вам, чалавеку дабрэйшай душы і сэрца, здароўя, дабрабыту ў сям'і, дабра і дабрыні, поспехаў у працы. Заставайцеся такой абавязковай, якой мы вас ведаем.

Удзячныя случчанкі Новікі, П'яніна, Усовіч.

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

Па гарызанталі: Сегнецук. Гравюра. Калина. Актэт. Тумак. Аер. Корад. Уран. Цыганне. Лот. Ранда. Акын. Матра. Рад. Бурлак. Мята. «Яма». Пах. Дэліб. Шагал. Нар. Каза. Кунава. Катар. Дуга. Азон. Іскоўр. Нагінік. **Па вертыкалі:** Савецкі. Мушкецёр. Такса. Гранак. Манера. Ала. Чака. Абух. Анкер. Ападуў. Конас. Туз. Таран. Прагон. Гонта. Рана. Табло. Док. Куна. Рута. Калініна. Унты. Амбал. Ніка. Рахунак.

Ну і ну!

БУСЕЛ-УЦЯКАЧ «ПРАІНСПЕКТАВАЎ» ДАРОЖНЫ РУХ

Ранкам у пятніцу са сталічнага заапарка збег бусел. І... пайшоў прагульвацца прама па праезнай частцы.

— Гэта незвычайнае здарэнне адбылося на вуліцы Ташкенцкай: птушка раптоўна вылецела на дарогу, з-за чаго ледзьве не трапіла ў дарожна-транспартнае здарэнне запоўненая пасажырамі маршрутка. Кіроўцу, каб пазбегнуць сутыкнення, давялося закладваць круты віраж, — расказала падрабязнасці здарэння старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Заводскага РУУС г.Мінска Настасся Крахціна. — Прагульваючыся па праезнай частцы, бусел сабраў вялікі натоўп людзей. На шчасце, усё абышлося: ніхто не пацярпеў, а саму непаслухмяную птушку неўзабаве вярнулі па месцы «прапіскі».

Сяргей РАСОЛЬКА.

АРЛАН-БЕЛАХВОСТ ЗАСТАЎСЯ ЗІМАВАЦЬ У СТАЛІЦЫ

САМЫ БУЙНЫ КРЫЛАТЫ ДРАПЕЖНІК БЕЛАРУСІ БЫЎ ЗАФІКСАВАНЫ АРНІТОЛАГАМІ НА РАЦЭ СВІСЛАЧ ПРАМЗОНЫ ШАБАНЫ

У сераду, 8 лютага, спецыялісты грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) ажыццяўлялі сінхронныя ўлікі вадаплаўных і каляводных птушак у Мінску.

Як паведаміў рэдакцыі спецыяліст па экалагічнай адукацыі АПБ Руслан Шайкін, усяго на водных аб'ектах сталіцы сёлета было ўлічана 4372 птушкі 16 відаў. Больш за ўсё птушак было заўважана на рэках Свіслач і Лошыца, а таксама на Сляпянскай воднай сістэме. Каля 95 працэнтаў усіх зімуючых птушак складаюць крыжанкі. Значна больш, чым у мінулыя гады, у Мінску гэтай зімой засталося лебедзяў-шыпуноў, якія добра адчуваюць сябе на вадасховішчы Крыніцы на паўночным захадзе горада. Там жа засталася на зімоўку белалобая гусь.

Сярод 16 відаў крылатых 5 занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Гэта вялікі савук, савук-луток, качка-шылахвостка, зімародак і арлан-белахвост. Амаль усе яны зімуюць на рацэ Свіслач. Арлан-белахвост быў зафіксаваны на рацэ Свіслач у прамзоне Шабаны.

Сяргей КУРКАЧ.

НЕ ПІЎ, НЕ КУРЫЎ І ДА 100 ГАДОЎ ДАЖЫЎ

У аграгарадку Дабрамыслі Лёзненскага раёна жыве адзін з, на жаль, нямногіх беларускіх мужчын, якім ужо за 100 гадоў.

Іван Вікенцьевіч Шэмель сваё стагоддзе адсвяткаваў у лістападзе мінулага года. Даглядае яго дачка, пенсіянерка Тэрэса Іванаўна Разведчанка. Разам жывуць ужо гадоў восем. А да гэтага Іван Вікенцьевіч жыў у роднай вёсцы Крывасельцы, у Браслаўскім раёне.

Да старажыла ў госці карэспандэнт «Звязды» прыйшоў разам са старшынёй Дабрамыслянскага сельвыканкама Надзеяй Папялкоўскай. Убачыўшы яе, паважаны дзядуля вельмі ўзрадаваўся. «Улада, улада да мяне прыйшла», — усё паўтараў ён. І дзякаваў за тое, што не забываюць. На здароўе і на іншае не скардзіўся.

Як расказала дачка дзядулі Тэрэса Іванаўна, бацьку і ёй вельмі прыемна, што мясцовыя школьнікі ўзялі шэфства над ветэранам. Вось снег нядаўна на дварэ пачысцілі, ды і ўвогуле гатовы дапамагчы ва ўсім, і не толькі перад святкаваннем чарговай гадавіны Перамогі.

У Івана Вікенцьевіча чацвёра дзяцей. Яго жонка рана пайшла з жыцця, і ён выхоўваў іх адзін. Дзякуючы настойлівасці бацькі, усе дзеці выйшлі ў людзі. У Івана Вікенцьевіча таксама пяцёра ўнукаў і шасцёра праўнукаў.

Старшы сын Франц стаў ваенным і паэтам. Ужо надрукавана восем яго паэтычных зборнікаў. У ліку іншых і зборнік «Рака часу», які выйшаў летась. Дачка Бярнарда скончыла педагагічны інстытут у Даўгаўпілсе, жыве ў Латвіі. Тэрэса, якая засталася з бацькам, у Дабрамыслі, шмат гадоў працавала бухгалтарам у мясцовай гаспадарцы. Самая малодшая дачка — Аліна — працуе медсястрой у вядомым маскоўскім ваенным шпіталі імя Бурдэнкі. Сам доўгажыхар скончыў усяго чатыры класы царкоўна-прыходскай школы.

— У чым сакрэт даўгалецця майго бацькі? Ён быў абыякавы да спіртнога, не курыў, — расказвае Тэрэса Іванаўна. — Затое вельмі любіў спяваць. І зараз часта спявае. У асноўным, на роднай польскай мове. І беларускія песні ведае...

Івана Вікенцьевіча прызвалі ў армію і адправілі на вайну ў 1944 годзе. Незадоўга да гэтага нарадзіўся яго старэйшы сын Франц. Іван Вікенцьевіч геройскі ваяваў і дайшоў да Берліна. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, ордэнам Жукава, медалямі... Пасля перамогі ён вярнуўся ў родныя мясціны. Працаваў у сельскай гаспадарцы.

На жаль, Іван Вікенцьевіч ужо не ходзіць, амаль што не бачыць, дрэнна чуе.

Але на 101-м годзе свайго жыцця ён поўны аптымізму і дабрыні... Дом, дзе жывуць разам з дачкой, у цёплую пару года поўны кветак. Тэрэса Іванаўна — кветкавод з вялікім стажам. Кветкі для яе — гэта больш чым хобі, сапраўдная любоў. Ахвотна дзеліцца расадай з суседзямі, дапамагае ў добраўпарадкаванні вёскі, за што яе вельмі цэняць і вяскоўцы, і мясцовы сельвыканкам.

Хай і з невялікім спазненнем, шчыра хочацца павіншаваць ветэрана з прыгожым юбілеем. «Звязда» ўсяго толькі 95, а Івану Вікенцьевічу ўжо больш за сто. Хай і надалей застаецца такім жа аптымістам!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Лёзненскі раён.

Усміхнемся

Я валодаю адмысловым майстэрствам — магу адкрыць шафу, пакласці рэчы і зачыніць дзверцы раней, чым яны пачнуць вываль-вацца адтуль.

Тлумачальная: «Я прыйшоў на працу ў 10.00, а не ў 8.00, таму што да 10.00 усё адно ніхто нічога не робіць, а толькі чай п'юць. А я столькі чаю выпіць не магу».

Муж увечары заходзіць на кухню.
— Хачу есці! Што на вячэру?
— Калі я пасмажу бульбу — як ты на гэта глядзіш?
— Як, як... Са слінаю на вачах...

На спаборніцтвах па стральбе золата атрымаў Іваноў, серабро — Пятроў, бронзу — Мікалаеў, а вось свінец дастаўся зменшчыку мішэняў Сідараву.

Хлопчык у аптэцы:
— У вас ёсць які-небудзь надзейны абязбольвальны сродак?
— Хлопчык, а што ў цябе баліць?
— Пакуль нічога, але тата ўжо пайшоў на бацькоўскі сход.

НА «РЭНО» — ПА ЧЫГУНЦЫ

У Полацкім раёне вечарам з-за грузавіка, які выехаў на чыгуначнае палатно, рух цягнікоў затрымаўся на 1,5 гадзіны.

Кіраваў грузавым аўтамабілем «Рэно» грамадзянін Кыргызстана, жыхар Бішкека 1981 года нараджэння. Аўто належыць прыватнаму прадпрыемству. Грузавік выехаў на дазваляльны сігнал святлафора на чыгуначны пераезд, абсталяваны спраўнай светлавой і гукавой сігналізацыяй. З-за тэхнічнай няспраўнасці тармазной сістэмы, прадухіляючы сутыкненне з сустрэчным транспартам, кіроўца вывеў аўто на чыгуначнае палатно. Пацярпелых у выніку гэтага надзвычайнага здарэння няма.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СЁННЯ

Месяц

Апошняя квадра 14 лютага. Месяц у сузор'і Шаляў.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.39	18.09	9.30
Віцебск —	8.32	17.55	9.23
Магілёў —	8.29	17.59	9.30
Гомель —	8.21	18.00	9.39
Гродна —	8.53	18.25	9.32
Брэст —	8.49	18.30	9.41

Імяніны

Пр. *Герасіма, Івана, Ігната, Канстанціна, Лукі, Рамана.*

К. *Бажэны, Бернардэты, Брыгіты, Марыі, Альгерда, Рыгора.*

Фота Валерыя КАВАЛЁНКА.



Усходні гараскоп на наступны тыдзень

ЦЯЛЬЦЫ ЎВЕСЬ ТЫДЗЕНЬ БУДУЦЬ У ГУШЧЫ ПАДЗЕЙ, А Ў ШАЛЯЎ ПРАЦА ЗАПАТРАБУЕ НЕЙМАВЕРНЫХ НАМАГАННЯЎ

АВЕН. У панядзелак або ў аўторак вас могуць наведаць выдатныя ідэі: іх лагічнасць і складнасць могуць закружыць галаву любому. Што ж, запішыце іх — потым спатрэбяцца. Калі не зможаце знайсці ім ужыванне — выдасце як навуковую фантастыку. У сераду абавязкова зробіце сабе невялікую перадышку. Другая палова тыдня — выдатны час для пераасэнсавання ўсяго таго, што вы паспелі зрабіць.

ЦЯЛЕЦ. Ваша ўнутранае імкненне да адзіноты практычна нездзяйсняльнае, бо ўвесь тыдзень вы будзеце ў самай гушчы падзей. З панядзелка па сераду пажадана не пачынаць новых спраў — менавіта ў гэты час могуць падпільноўваць ілюзіі і неспадзяваныя абставіны, якія перашкаджаюць вашым задумам. Не вельмі давярайцеся калегам: шматлікімі іх учынкамі будзе кіраваць зайздрасць.

БЛІЗНЯТЫ. Час успомніць пра сябе. Можна брацца за рэалізацыю планаў і задум, якія даўно выношваеце. Паспрабуйце, тым не менш, думаць рэалістычна і не пераацэньваць свае сілы і магчымасці. У прафесійным плане вас могуць чакаць засмучэнні і расчараванні, але гэта не падстава кідаць працу, калі, вядома, яна любімая. Пажадана, каб вы знаходзіліся далей ад начальства.

РАК. Вас будзе з'ядаць нецярпенне. Павысіцца агульны тонус, павялічыцца актыўнасць і палепшыцца настрой. Парада, атрыманая ад блізкага сябра, дапаможа знайсці выхад з тупіковай сітуацыі, калі вы ў яе патрапіце. Поспех любога пачынання будзе залежаць ад зацікаўленасці ў выніку і гатоўнасці праявіць ініцыятыву.

ЛЕЎ. Тыдзень можа пачацца з прыемных неспадзевак: магчыма, вас знойдзе сябар, з якім вы даўно не мелі зносін. Будзьце ўважлівымі, не забывайце ў мітусні або ў прыступе безуважлівасці выключаць электрычнасць або газ, замыкаць уваходныя дзверы. Найбольш спрыяльным днём на гэтым тыдні для вас стане пятніца.

ДЗЕВА. Вашых сіл і аўтарытэту хапіла б цяпер на многае, але не варта распыляцца. Серада — удалы дзень для паступлення на новую працу, для прэзентацый і для правядзення аўкцыёнаў. У чацвер сітуацыя, якая склалася, можа запатрабаваць ад вас сур'ёзнасці і засяроджанасці, будзе проста неабходна перш прадумаць свае дзеянні, а затым прыступаць да рашэння пэўных задач. Вам неабходна вельмі ўважліва ставіцца да сваіх і чужых думак, слоў і ўчынкаў.

ШАЛІ. Праца можа запатрабаваць ад вас неймаверных намаганняў, таму лепш адразу вырашыць для сябе, з якім яе аб'ёмам вы можаце рэальна справіцца, і ні пад якім выглядам не згаджацца на павелічэнне нагрузкі. Не зацыклівайцеся на дробных задачах, а засяродзьцеся на самым галоўным. Не шкадуйце часу і сіл на праверку надзейнасці новых партнёраў — толькі тады ёсць сэнс пачынаць сумесную дзейнасць. Поспех могуць прынесці новыя ідэі і кантакты, у той жа час паспрабуйце пазбягаць непатрэбных, пустых сустрэч.

СКАРПІЁН. Магчымыя пэўныя цяжкасці, але перад імі дастаткова проста не адступаць — тады поспех проста непазбежны. Сёння лепш абапірацца на праверэныя метады, а нестандартныя падыходы выкарыстаць толькі як дадатак. У працы неабходна выяўляць цярпенне і зацятасць, тады перашкоды ператворацца ў пыл, які панясе ветрам. Ваш аўтарытэт у калектыве будзе ўстойлівым. Не толькі супрацоўнікі, але нават і кіраўніцтва паспрабуе пайсці вам насустрач, стварыць спрыяльныя ўмовы для працы.

СТРАЛЕЦ. Душа будзе патрабаваць рамантыкі, у той час як зоркі настойліва рэкамендуюць выявіць як мага большую практычнасць ва ўсіх галінах. Лёс можа даць шанц вырашыць шматлікія праблемы. Вельмі не перашкодзіць пачуццё меры, у тым ліку — і ў працы. У любых справах шукайце для сябе карысць, бо альтруізм не прынясе толку ні вам, ні таму, для каго вы будзеце старацца. Давядзецца разлічваць толькі на свае сілы — сябры і сваякі пры ўсім жаданні нічым не змогуць дапамагчы.

КАЗЯРОГ. Размераны бег падзей можа быць парушаны абставінамі, якія можна было прадбачыць. Будзьце напагатове, але нічога не прадпрымайце, пакуль не разбярацеся, што да чаго. Непажадана звязвацца з сумніўнымі праектамі і рызыкаваць сваім дабрабытам. Залішняя самаўпэўненасць можа прывесці да сварак з калегамі.

ВАДАЛЕЙ. Паспрабуйце праявіць мэтанакіраванасць і рашучасць. Не сумнявайцеся ў пастаўленых мэтах — хоць бы спрабуйце іх дасягнуць. Аналізуйце свае памылкі і, узброіўшыся новым досведам, ідзіце наперад. Паспрабуйце надаць дастаткова ўвагі сваякам, у адваротным выпадку ў сям'і магчымы разлад. На выхадных адпачніце ў коле родных або сяброў.

РЫБЫ. Можаце падрыхтаваць выдатную базу для будучых поспехаў. Для гэтага трэба ўсяго толькі добра працаваць — і зусім хутка ўсе вашы старанні акупяцца спаўна. Панядзелак можа аказацца поўны клопатамі аб выкананні абяцанняў перад навакольнымі. У аўторак імкніцеся нічога не адкладваць на потым. У сераду вам нагадае пра сваё існаванне чалавек, з якім вы доўгі час не мелі зносін.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СМАЧНА ЕСЦІ!

Валянцінкі на талерцы

Неўзабаве шмат хто з нас будзе святкаваць Дзень усіх закаханых і ўжо думае пра тое, чым жа такім смачненькім і незвычайным здзівіць свайго каханага (або каханую) на 14 лютага.

Выбар спосабу віншавання і від падарунка шмат у чым залежыць ад характару вашых адносін. Можна прыгатаваць і рамантычную вячэру, упрыгожыўшы стравы знакамі дня святога Валянціна — сэрцайкамі, можна спячы торцік-сэрца або пірожныя-валянцінкі.

Калі вы плануеце гатаваць сытную вячэру, то лепш узяць за аснову нешта традыцыйнае і дапоўніць гэта якой-небудзь смачнай салатай, упрыгожанай сэрцайкамі. Калі святочнай рамантычнай вячэры для дваіх не прадбачыцца, можна проста пацешыць каханага хатнімі пірожнымі ў форме сэрца.



Памятайце, што ёсць варыянт прыгатавання стравы ў форме сэрца, а ёсць варыянт упрыгожвання любой стравы сэрцайкамі, выразанымі з падручных матэрыялаў або намаляванымі на паверхні стравы.

Шчаслівыя ўладальнікі формачак-сэрцайкаў для запякання могуць спячы ў іх кексы, пірагі, каржы для торта, тварожныя запяканкі, суфле (салодкія або мясныя). Акрамя таго, у такіх формах можна прыгатаваць квашаніну, заліўное або жэле.

Яшчэ бываюць такія металічныя контуры — сэрцайкі, падобныя на пяльцы, якія кладуць на патэльню, а ўнутр контуру наліваюць амлет або яйкі ці цеста. І атрымліваюць яечню, амлет або бліны ў форме сэрцайкаў.

Для атрымання торта або пірага ў форме сэрца не абавязкова мае адпаведную форму. Для гэтага лепш загадзя падрыхтаваць трафарэт — намаляваць на кардонцы роўнае сэрца і выразаць яго. Калі ў вас бісквітнае цеста — спачатку трэба спячы прамавугольныя або круглыя каржы, а потым ужо выразаць з іх сэрца. Калі вы пячэце са слаёнага або пясочнага цеста, то трэба раскачаць цеста і выразаць з яго сэрцайкі, а потым ужо выпякаць іх.

З чаго зручна выразаць сэрцайкі для ўпрыгожвання стравы?

Салатна-агароднінныя сэрцайкі: радыска, агуркі, салодкі перац, вараны бурак і морква і яечны бялок. Можна разрэзаць агурок, зрэзаць 2 лустачкі наўскасяк і прыкласці іх адзін да другога — атрымаецца сэрца. Хораша і проста.

Фруктовыя сэрцайкі: ківі (нарэзаць кружкамі і з іх выразаць сэрцы), апельсінавая лупіна, яблыкі і грушы (апырскаць іх лімонным сокам, а то пацямнеюць) і г.д.

З цвёрдых матэрыялаў лепш выразаць сэрцайкі кароткім вострым нажом, а з больш мяккіх — выціскаць жалезным сэрцайкам (формачкай для печыва).

Як намаляваць сэрцайка-валянцінку на торце або пірагу?

Варыянтаў малявання салодкіх сэрцаў шмат. Можна зрабіць гэта пры дапамозе крэму, а можна проста пасыпаць корж цукровай пудрай (какосавай стружкай або какавай), папярэдне закрыўшы патрэбныя месцы шаблончыкамі сэрцаў (звычайныя кардонкі). Калі іх прыняць, то атрымаецца малюнак на фоне белай цукровай пудры. Або можна формачку для печыва ў форме сэрцайка паставіць на корж, папярэдне змазаны крэмам або залітыя глазурай (тут яны выступяць як клей), і запоўніць яе якой-небудзь кандытарскай абсыпкай, якая прыліпне да салодкага «клею». Формачку зняць, а контуры сэрца можна падкрэсліць, напрыклад, тонкімі палосачкамі апельсінавай лупіны.

-2824-

А на просты хатні сняданак на Дзень закаханых можна прыгатаваць вось такую смачную яечню з сасіскай у форме сэрца. Бярэм сасіску, разразаем яе напалову, не даразаючы да канца з аднаго боку каля 1 см. Разрэзаныя канцы злучаем разам зубачысткай так, каб атрымалася сэрца. Перакладваем на разагрэтую патэльню з маслам і ўнутр сэрцайка разбіваем яйка. Даводзім да гатоўнасці.

Або гэтую сытную і простую страву — нешта сярэдняе паміж яечняй і бутэрбродам. Разагрэць алей на патэльні. Выразаць у сярэдзіне кавалачка хлеба сэрцайка, падсмажыць з аднаго боку. Перавярнуць хлеб, разбіць туды яйка так, каб жаўток застаўся цэлым, пасаліць, паперчыць і накрыць вечкам. Праз некалькі хвілін, калі жаўток «схопіцца», страва гатова.

Ну а тыя, хто жадае папесціць сваю другую палоўку незвычайным дэсертам, могуць прыгатаваць **шакаладныя сэрцайкі.**

Спатрэбіцца: *100 гр. шакаладу, разламанага на маленькія кавалачкі; 1 ст. л. ачышчаных фісташак, дробна парэзаных; 2 пячэнні, дробна пакрышаныя; 4 шт. курагі, дробна парэзаныя.*



Намаляваць на лісце пергаменту 16 сэрцайкаў. Растапіць шакалад у маленькай місцы, пастаўленай на каструлю з кіпячай вадой. Затым зняць каструлю з агню і даць трохі астыць і загуснуць шакаладу.

Намазаць прыкладна па 1 чайнай лыжцы растопленага шакаладу на намаляванае сэрца на паперы. Змяшаць астатнія інгрэдыенты і пасыпаць сэрцайкі зверху. Даць астыць і зацвярдзець. Акуратна нажом зняць з паперы і падаваць да кавы.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

Духмяныя валянцінкі

Трэба выразаць 2 аднолькавыя сэрцайкі з чырвонай тканіны і напоўніць іх духмянымі сушанымі зёлкамі. Калі няма сваіх, можна купіць у аптэцы. Гэта таксама могуць быць і спецыі, такія як кардамон, карыца ці іншыя, якім вы аддаяце перавагу. Але тады трэба зрабіць пад тканіну падкладку і спецыі перамяшаць з якім-небудзь напаўняльнікам. Напрыклад, з нарэзаным паралонам ці сінтэпонам.



Рукавічкі для закаханых



Вельмі актуальны падарунак для халоднай зімы. Пражу, узор і колер ёсць магчымасць выбраць. Зрабіць такое зможа нават навічок. А ідэя вельмі цудоўная. Моладзь у захапленні. А можа, і хтосьці з людзей больш сталага веку рызыкне такое надзець... Ну хоць на адпачынку.

-2825-

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У.ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н.КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л.ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 660. Нумар падпісаны ў 19.30 10 лютага 2012 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12